КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 39 (262) ◂ 21 кастрычніка ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**АЛЕГ МАНАЕЎ**

Стар. 4

**СІЛАВІКІ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ НА ПАСТАЎЛЕНУЮ МЭТУ**

Юрысты б'юць трывогу — у прававое поле спрабуюць увесці практыку забароны і рэпрэсій

Стар. 6

**БАГРАЦІЁН СУПРАЦЬ СААКАШВІЛІ**

Грузінскі манархічны праект ва ўмовах вакууму апазіцыі і выкліканай сыходам Саакашвілі магчымай палітычнай дэстабілізацыі можа быць запатрабаваны грамадствам

Стар. 11

**НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ: ПАЧАТАК**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ЯЗЭП СТАБРОЎСКІ — ЛЕТАПІСЕЦ ВАЙНЫ**

Нарыс Сяргея Чыгрына

▸ З НАГОДЫ

# СВЯТЛО Ў ТУНЭЛІ... СУСТРЭЧНАГА ЦЯГНІКА

Вольга ХВОІН

**З 20 кастрычніка на Беларускай валютна-фондавай біржы (БВФБ) функцыянуе адзіная гандлёвая сесія. З гэтага ж дня ў Беларусі адмянілі межы ваганняў кошту кошыка валют. Эканамісты прарочаць чарговую хвалю дэвальвацыі, гіперінфляцыі ды іншых спадарожных «радасцяў». Карацей, варта запасацца цярпеннем.**




Цяпер курс куплі і продажу замежнай валюты на адзінай гандлёвай сесіі БВФБ будзе ўстанаўлівацца па выніках фіксінгу зыходзячы з попыту і прапановы. Курс фіксінгу на адзінай гандлёвай сесіі будзе з'яўляцца афіцыйным курсам Нацыянальнага банка з дня, што ідзе за днём правядзення таргоў. Межы ваганняў кошту кошыка валют, устаноўленых на 2011 год, адмяняюцца. Нацбанк заявіў пра намер праводзіць у ходзе таргоў на БВФБ «мінімальныя валютныя інтэрвенцыі, якія будуць накіраваны выключна на згладжванне рэзкіх ваганняў абменнага курсу». Гэтыя меры будуць прынятыя ў адпаведнасці з планам мерапрыемстваў па выхадзе на адзіны раўнаважны курс беларускага рубля на ўсіх сегментах валютнага рынку.

У апошні дзень перад адзінай сесіяй курс долара склаў 8 790 рублёў, еўра — 12 610 рублёў, расійскі рубель — 283 беларускія рублі. Курс рубля ў першы дзень адзінай сесіі на біржы ўсталяваўся на такім узроўні: долар — 8 680 рублёў, расійскі рубель — 277 рублёў, еўра — 11 900 рублёў. Рост афіцыйнага курсу, па прагнозах экспертаў, справакуе хвалю гіперінфляцыі і чарговую дэвальвацыю. Бо курсы Нацбанку на 19 кастрычніка былі істотна ніжэйшыя за рынкавыя (хаця Нацбанк не хаваў інтэрвенцый на БВФБ у кастрычніку): долар ацэньваўся ў 5 730 рублёў, еўра — 7 853.

«Будзе адзіны рычачны курс, высокі, — гаворыць былы старшыня Нацбанку Беларусі Станіслаў Багданкевіч. — Гэта ўсё азначае толькі тое, што дэ-юрэ зацвердзяць, што ўжо ёсць дэ-факта. Гэты курс сведчыць аб аграмадным падзенні нацыянальнай валюты. Што справакуе высокі ўзровень спажывецкіх цэн, коштаў на прадукцыю вытворцаў, высокі ўзровень валютнага курса. Усё гэта прывядзе да падзення тэмпаў росту ВВП, узроўню жыцця. У нейкай ступені Лукашэнка мае рацыю: на некаторы час курс можа прыпасці. Але калі не будзе прынята іншых мераў: пашырэнне канкурэнцыі, адмова ўлады ад адміністрацыйнага ўмяшання ў бізнэс, абмежаванне крэдытавання стратных прадпрыемстваў, скарачэнне бюджэтных расходаў і інш. — калі ўсяго гэтага не будзе, то можна чакаць далейшага правалу ў эканоміцы. Патрэбная сістэмная комплексная праграма рэформаў, яна кавалкамі аб'яўленая. І калі будзе праводзіцца, то можна пабачыць святло ў канцы тунэлю, магчыма, праз два-тры гады. Цяпер жа мы маем вынік той эканамічнай палітыкі, што праводзілася апошнія гады. Але гэта трэба рабіць, толькі сістэмнай праграмы ўрада я пакуль не бачу».

Аляксандр Лукашэнка 18 кастрычніка выступіў у сваёй традыцыйнай манеры: «Майце на ўвазе, што курс долара такі не будзе. Зараз звядзём абедзве сесіі ў адну літаральна днямі, і курс долара гэты абрынецца. Калі ўжо шчыра казаць, мы высокі курс долара і падтрымлівалі, не ўмешваючыся».

«Я ж бачу, хто робіць заяўкі на гэтыя долары, на замежную валюту. Гэта ў асноўным так званыя індывідуальныя прадпрымальнікі і тыя, хто ўвозіць імпарт некрытычнага парадку. Ну дык чаму ім долар танны прадаваць? Але галоўнае — гэта тое, што прадпрыемствы цяпер не прадаюць валюту, яны чакаюць адзінага курсу, які ён складзецца. І як толькі вырьецца на рынак гэтая ўся наяўнасць, доларавая і еўра, якую мы аддаём цяпер на закупку газу і гэтак далей, то прапановы па долары будуць вельмі высокія», — мяркуе беларускі лідар.

Выказаўся Лукашэнкі і наконт прагнозаў (ды якія прагнозы! — ужо канстатацыя факту) наконт росту цэн. «Шмат хто кажа: кошты, цэны растуць, давай затыкай. Ні ў якім выпадку гэта нельга рабіць цяпер. Так, трэба кантраляваць, каб «разбэшчанасці» не было, але ў нас нават не ў «разбэшчанасці» справа. У нас цэны такога ўзроўню, што яны ўжо ўперліся ў попыт насельніцтва. Далей ужо кошты не могуць так расці», — прыводзіць словы Лукашэнкі прэс-служба прэзідэнта. І тут з беларускім лідарам не паспрачаешся: цэны сапраўды такія, што расці ім у межах спажывецкага попыту не так і многа засталося. А калі папросту, то крамы пераходзяць да асартыменту прадукцыі адпаведнага ўзроўню — цэны на кілбасу вараную, паштэт і субпрадукты і праўда яшчэ не дасягнулі мяжы «аблізваемся — праходзім міма».

Эканаміст Дзмітрый Крук пакуль ад канкрэтных парадаў беларусам, як ім жыць і што рабіць далей, устрымліваецца, маўляў, ёсць шанцы як на стабілізацыю, так і на падзенне. «Пасля ўніфікацыі валютнага курса беларускі рубель умацуецца на некаторы перыяд, дзесьці да канца кастрычніка. Што будзе далей — нявызначана. Але мая інтуіцыя падказвае, што цяперашні курс адпавядае рэальнай сітуацыі. Але дзеянні ўладаў, як, напрыклад, падвышэнне заробкаў, сапраўды могуць мець нездавальняючы эфект на дынаміку цэнаў, што будзе правакаваць адмоўныя працэсы ў эканоміцы. Пакуль жа ёсць перадумовы для таго, каб сітуацыя стабілізавалася. Але ўсё будзе залежаць ад дзеянняў уладаў», — разважае эканаміст.

Варта нагадаць: магчымасцяў падтрымліваць курс рубля адміністрацыйна Нацбанк мае ўсё менш і менш — золатавалютныя рэзервы стабільна скарачаюцца. Адна надзея на крэдыты і даходы ад продажу дзяржактываў. Але крэдыты трэба аддаваць (і ўжо наступным летам), а дзяржактывы — хіба што апошняе, што засталося каштоўнага ў эканамічным цудзе Беларусі.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ВІЦЕБСК. СУД АДХІЛІЎ СКАРГУ

Суддзя Чыгуначнага райсуду Алена Грабянчук адхіліла скаргу Аляксея Гаўруцікава — даверанай асобы Мікалая Статкевіча ў часе мінулай прэзідэнцкай кампаніі, кіраўніка абласной арганізацыі Руху «За Свабоду» Хрыстафора Жаляпава і сябра КХП БНФ Яна Дзяржаўцава.

Актывісты патрабавалі, каб суд даў ацэнку дзеянням старшыні адміністрацыі Чыгуначнага раёну, які за гэты год не задаволіў ніводнай заяўкі на мітынгі ці пікеты.

Паводле судовай пастановы, кіраўнік раённай адміністрацыі Юры Маскалёў меў рацыю, калі адмаўляў апазіцыянерам, бо ён кіраваўся рашэннем Віцебскага гарвыканкаму № 881 пра парадак падачы заявак на акцыі. У адпаведнасці з гэтым рашэннем, заяўнікі мусяць ад пачатку заключыць дамовы на абслугоўванне мерапрыемства медыкамі, міліцыянтамі і службай ЖКГ да прыкладсці іх да заяўкі.

Звяртаючыся ў суд, актывісты запатрабавалі, каб была дадзена ацэнка і кіраўніцтву гэтых структураў, бо яны перыядычна адмаўляліся складаць дамовы без папярэдняга дазволу ўладаў. Падчас працэсу, які распачаўся 13 кастрычніка, увогуле высветлілася, што з ЖКГ і міліцыяй адмысловых дамоваў заключаць не трэба: яны мусяць захоўваць чысціню і сачыць за правапарадкам падчас акцый у сілу сваіх прафесійных абавязкаў.

Аднак суддзя Алена Грабянчук гэтую праблему разглядаць не стала, толькі вынесла прыватнае азначэнне: рэкамендавала актывістам ініцыяваць судовыя працэсы па кожнай адмове з кожнай канкрэтнай арганізацыі.

### ГОМЕЛЬ. АКТЫВІСТА ЗНОЎ АШТРАФАВАЛІ

Суддзя Цэнтральнага раёна Гомеля Марына Дамненка аштрафавала актывіста Руху «За Свабоду» Уладзіміра Няпомняшчых на 105 тысяч рублёў за лаянку.

Гэта ўжо другое пакаранне за Народны сход. 7 кастрычніка позна ўвечары спадара Няпомняшчых затрымалі супрацоўнікі Цэнтральнага райаддзелу міліцыі на праспекце Леніна, калі ён расклейваў налепкі пра Народны сход. Уладзімір не аднеквайся: сапраўды клеіў.

У дачыненні да яго склалі пратакол за парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавага мерапрыемства і да суду адвезлі ў ізалятар часовага ўтрымання.

10 кастрычніка суддзя Алена Цалкова аштрафавала Уладзімера Няпомняшчых на 175 тысяч рублёў.

Другі суд завяршыўся 19 кастрычніка другім штрафам. Вырак выглядаў дзіўным: выкліканыя ў суд супрацоўнікі Цэнтральнага РАУС Віталь Ятчанка, Андрэй Казлоў, Аляксандр Дзёмін, якія прысутнічалі на затрыманні актывіста 7 кастрычніка, засведчылі, што лаянкі ад яго не чулі.

Як лічыць Няпомняшчых, суддзя пакарала яго на падставе ілжывага рапарту маёра Амельчанкі. І пратакол пра дробнае хуліганства за лаянку, на ягоную думку, склалі на падставе загаду начальства, каб хоць неяк апраўдаць ягоны арышт да суду.

### БРЭСТ. КІСЛЯКА ЎСЁ Ж ДАКТЫЛАСКАПУЮЦЬ?

19 кастрычніка Ленінскі суд горада Брэста разгледзеў заяву Рамана Кісляка, які хацеў запярэчыць павальнай дактыласкапіі.

«Адмовілі ў задавальненні скаргі на дактыласкапію. Я скардзіўся на Міністэрства ўнутраных справаў, Ленінскі РАУС і яго ўчастковага інспектара, які прынёс мне накіраванне на дактыласкапію. Яшчэ раней, калі я быў затрыманы за распаўсюд газет, і яны мне круцілі руку, каб прымусіць адкачаць пальцы, я ім казаў: прыносьце накіраванне, позву, і я абскарджу», — сказаў праваабаронца, актывіст Руху «За Свабоду» ў каментары «Еўрарадыё».

Спадар Кісляк лічыць, што кампанія дактыласкапіі, якая разгарнулася пасля выбуху ў Мінску ў ліпені 2008 года, парушае прэзумпцыю невінаватасці і ўрэшце будзе скіраваная на тое, каб «пасадзіць пад каўпак» усіх іншадумцаў.

Праваабаронца ўжо запатрабаваў матывіровачную частку прысуду дзеля таго, каб звярнуцца з касацыяй у абласны суд. Пры патрэбе ён мае намер звярнуцца ў Камітэт па правах чалавека ААН.

**Паводле прэс-службы Руху «За Свабоду»**

ЗАЯВА

## ЗАХАВАЕМ БЕЛАРУСКУЮ «РАНІЦУ»

**Сакратарыят ТБМ 14 кастрычніка прыняў адмысловую заяву з нагоды спынення выхаду адзінай беларускамоўнай дзіцячай газеты.**

«Са сродкаў масавай інфармацыі стала вядома, што па загадзе чыноўнікаў спыніла сваё існаванне адзіная беларускамоўная дзіцячая газета «Раніца». Гэта выданне на працягу 82 гадоў несла беларускае слова ў беларускую школу, выхоўвала патрыятызм і любоў да беларускай мовы і культуры ў нашых дзетак. Не інакш як здзекам выглядае абяцанне чыноўнікаў зрабіць з «Раніцы» маленькі штомесячны дадатак да рускамоўнай газеты», — гаворыцца ў заяве.

У сувязі з гэтым ТБМ заклікала грамадзян Беларусі неадкладна звяртацца да беларускага ўрада з патрабаваннем аднавіць выхад газеты «Раніца» і абʼявіць падпіску на гэтае выданне на наступны год, год юбілеяў класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Танка.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

## ШТРАФ ПРАВААБАРОНЦУ

Генадзь КЕСНЕР

**Інспекцыя Міністэрства па падатках і зборах Партызанскага раёна Мінска 19 кастрычніка пастанавіла спагнаць з намесніка старшыні зачыненага ўладамі Праваабарончага цэнтра «Вясна» Валянціна Стэфановіча штраф у памеры 4 727 330 беларускіх рублёў. Гэтая сума складае 15% ад быццам бы «па неасцярожнасці» нявыплачанага падатку на прыбытак за 2009–2010 гады.**



Цікавасць да асобы праваабаронцы і юрыста зʼявілася пасля таго, як Літва і Польшча перадалі беларускім уладам дадзеныя пра банкаўскія рахункі Валянціна Стэфановіча, а таксама кіраўніка «Вясны» Алеся Бяляцкага, які зараз знаходзіцца ў следчым ізалятары № 1 МУС Беларусі на сталічнай вуліцы Валадарскага ў чаканні суда за нібыта ўхіленне ад выплаты падаткаў у буйным памеры. Па словах Валянціна Стэфановіча, сродкі знаходзіліся на рахунку, куды паступалі грошы на дзейнасць «Вясны».

«Згодна з вынесенай пастановай, я «па неасцярожнасці» не ўказаў усю суму прыбытку, якая падлягае падаткаабкладанню. У якасці змякчаючых абставінаў была прызнана наяўнасць у мяне двух малалетніх дзяцей, — распавёў праваабаронца. — Фактычна з пастановай мяне азнаёмілі яшчэ да разгляду маёй справы. Калі на мяне складалі пратакол аб адміністратыўным правапарушэнні, мне прапанавалі распісацца ў пастанове па справе адносна згаданага правапарушэння ў той частцы, што я азнаёмлены з матэрыяламі справы. На гэта я адказаў, што пастанова яшчэ не вынесена, пра што і напісаў у пратаколе аб адміністратыўным правапарушэнні. Гэта значыць, што пастанова ў дачыненні да мяне была вынесена яшчэ да таго, як адміністратыўная справа была разгледжана па сутнасці».

Валянцін Стэфановіч таксама заяўляў хадайніцтва аб больш поўным перакладзе матэрыялаў справы, бо ў раздрукоўках з банку, якія былі прадстаўлены праваабаронцу, не ўсё было перакладзена на зразумелую мову. «Напрыклад, падставы грашовага пераводу з галандскага аддзялення «Amnesty International» былі пазначаны толькі па-англійску, і я лічу, што гэта мае істотнае значэнне для разгляду справы і ўстанаўлення маёй вінаватасці ў здзяйсненні правапарушэння. Але ўсё было адхілена», — паведаміў юрыст.

Па словах Валянціна Стэфановіча, ён збіраецца абскардзіць пастанову Партызанскай раённай інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах у вызначаны законам дзесяцідзённы тэрмін. Варта адзначыць, што першапачаткова памянёная інспекцыя мелася спагнаць з праваабаронцы 31 500 000 рублёў быццам бы ўтоенага падатку, а таксама 6 000 000 рублёў пені.

СПРАВА

## ПОЛЬШЧА ХОЧА ВЫДАЦЬ УЦЕКАЧА?

**Беластоцкі суддзя Шчэсны Шыманьскі адправіцца ў Беларусь, каб заслухаць сведак у справе беларускага палітуцекача Андрэя Жукаўца.**

Такое рашэнне прыняло Міністэрства юстыцыі Польшчы. Падпісаць дазвол на паездку меў права толькі міністр юстыцыі Польшчы Кшыштаф Квяткоўскі. Пры гэтым польскі суддзя збіраецца ў Беларусі цесна супрацоўнічаць з беларускімі праваахоўнымі органамі. Раней гэты ж самы суддзя прызнаў, што лічыць беларускія суды справядлівымі і абʼектыўнымі.

Паводле словаў Андрэя Жукаўца ён мае доказы, што на сведак па яго справе ў Беларусі аказваецца ціск з боку спецслужбаў. Гэтыя доказы ён спрабаваў прадставіць на судзе, але суддзя Шыманьскі не захацеў вывучаць гэтыя доказы.

Нагадаем, што прадпрымальнік і былы маладафронтавец Андрэй Жукавец у Беларусі матэрыяльна падтрымліваў «Малады фронт» і праваабаронцаў. У 1999 годзе Жукавец зʼехаў з Беларусі і папрасіў палітычны прытулак у Польшчы. У Беларусі на той час супраць Жукаўца была распачата крымінальная справа.

Беларускі бок дамагаецца выдачы Жукаўца. У Польшчы суд над палітуцекачом цягнецца амаль 12 гадоў.

Два месяцы таму ўкраінскі Цэнтр «Супрацоўніцтва без межаў» выступіў са спецыяльнай заявай па справе Жукаўца, у якой запатрабаваў ад польскіх уладаў спыніць справу супраць беларускага патрыёта.

**Паводле прэс-службы «Супрацоўніцтва без межаў»**

ПАДТРЫМКА

## ПРЫЗНАЦЬ АНАРХІСТАЎ ПАЛІТВЯЗНЯМІ

Таццяна ШАПУЦЬКА

**Беларускія праваабаронцы і палітыкі працягваюць вызначаць статус «бабруйскіх анархістаў»: палітычныя вязні ці хуліганы-радыкалы. Тым часам, сусветна вядомая праваабарончая арганізацыя «Нарвежскі Хельсінкскі камітэт» (НХК) збіраецца прызнаваць асуджаных на 7 гадоў Яўгена Васьковіча, Паўла Сырамолатава і Арцёма Пракапенку палітвязнямі.**

Праваабаронца Бэрыт Ліндаман, адказная за Беларусь, Украіну і Азербайджан, на пытанне карэспандэнта «Новага Часу» пацвердзіла, што НХК валодае інфармацыяй пра складзены беларускім бокам спіс палітвязняў па формуле «11+3». Нагадаем, гэты спіс уключае Саннікава, Статкевіча, Дашкевіча, Лобава, Аўтуховіча, Бяляцкага, Аліневіча, Дзядка, Франкевіча, Бандарэнку, Севярынца (11 чалавек) + 3-х бабруйскіх анархістаў, наконт дзеяннаў якіх (кіданне кактэйлю Молатава ў будынак бабруйскага КДБ) адзінай пазіцыі пакуль няма. «Нам трэба яшчэ раз пракансультавацца з «Вясною», але, хутчэй за ўсё, бліжэйшым часам мы прызнаем трох бабруйскіх хлопцаў палітычнымі вязнямі. У нас адрозныя ад арганізацыі «Міжнародная Амністыя» крытэрыі вызначэння статуса палітвязня. «Амністыя» прызнае асобаў вязнямі сумлення, таму яны маюць надзвычай шмат крытэрыяў, часам проста невыканальных. Мы ж прызнаем людзей палітычнымі вязнямі, а для гэтага нам дастаткова доказу, што прысуд матываваны палітычнымі прычынамі», — паведаміла Бэрыт Ліндаман.

Статус палітвязня надзвычай важны, бо ён азначае ўключэнне людзей у «палітычны гандаль» паміж беларускімі ўладамі і еўрапейцамі, дае шанец маладым хлопцам выйсці на волю на хвалі масавых вызваленняў беларускіх палітвязняў, а не адбываць 7-гадовыя пакаранні ў турмах строгага рэжыму да канца тэрміна. Відавочна, еўрапейцы гатовыя даць ім гэты шанец, справа застаецца за беларусамі.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# КЛЮЧ НА СТАРТ!




Сяргей САЛАЎЁЎ

**Здаецца, прэзідэнт «сінявокай» даў старт чарговай выбарчай кампаніі. Шляхам уважлівага чытання выбарчага кодэкса можна вызначыць, калі яна пачнецца. Выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі павінны прайсці не пазней за 26 верасня 2012 года. Менавіта гэтыя выбары і абмяркоўваліся на сустрэчы кіраўніка дзяржавы са старшынёй Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзіяй Ярмошынай.**

Паводле прагнозаў Аляксандра Лукашэнкі, выбары будуць няпростымі. «Мы падыходзім яшчэ да аднаго перыяду, які ўзрушае асаблівую частку нашага грамадства: менш за год засталося да парламенцкіх выбараў, — цытуе Лукашэнку яго прэс-служба. — Мы ўжо думалі, што мінулая выбарчая кампанія (прэзідэнцкія выбары 2010 года) будзе пікам напружання ў краіне, але, думаю, мы глыбока памыляліся».

Канешне, «глыбока памыляліся», гледзячы на фінансава-эканамічны крызіс у краіне. Пакуль што выйсця з гэтага крызісу не бачна. Таму Лукашэнка засцерагае: «У нас вельмі хочуць узрушыць народ, каб перавярнуць краіну», — заявіў Аляксандр Лукашэнка на нарадзе ў Мінску 18 кастрычніка. «Трэба працаваць з людзьмі, — заклікаў Лукашэнка кіраўнікоў абласцей. — Гэтая сітуацыя — яна пройдзе. Да новага года мы спакойна можам разрушыць гэтую сітуацыю».

Са свайго боку, Лукашэнка таксама прымае нейкія захады. Ён заявіў пра недапушчальнасць змянення выбарчага заканадаўства. «Я б не стаў разглядаць варыянты, як ад нас сёння некаторыя патрабуюць, ломкі выбарчага заканадаўства. Гэта абсалютна не прымальна напярэдадні палітычнай кампаніі», — падкрэсліў Лукашэнка.

То бок, зараз ужо час — «напярэдадні». Такім чынам, усім, хто збіраецца ўдзельнічаць альбо байкатаваць выбары, трэба рыхтаваць «сані летам», хоць лета і скончылася.

Дарэчы, дзіўная сітуацыя атрымліваецца. Замест таго, каб працаваць над пытаннем змянення выбарчага заканадаўства ў міжвыбарчы перыяд, Ярмошына і Лукашэнка заўсёды чакаюць «кропкі невяртання», а потым гавораць: «Немагчыма! Немэтазгодна! Нельга мяняць заканадаўства за тры месяцы да выбараў! Камісіі да гэтага не падрыхтаваныя! Ніхто да гэтага не падрыхтаваны!» Хаця, здавалася б, за 2011 год прайшлі дзве сесіі парламента, на якіх гэта пытанне можна было б разгледзець. І яшчэ адна — вясновая — засталася ў 2012–м. За гэты час можна было б што заўгодна падрыхтаваць і прыняць.

Дарэчы, 19 кастрычніка палітычная «шасцёрка» (АГП, «Справядлівы свет», рух «За свабоду», «Гавары праўду!», БНФ і аргкамітэт БХД) абмеркавалі апошнія рэпрэсіўныя змены ў беларускім заканадаўстве. Як выказаўся лідар АГП Анатоль Лябедзька, «ніякіх выбараў у Беларусі з 1994–1995 года няма». «Сёння ёсць магчымасць актуалізаваць тое пытанне (аб тым, каб улада выбіралася, а не прызначалася). На пасяджэнні «шасцёркі» мы вырашылі аднавіць камунікацыі з БДІПЧ АБСЕ. Ясна, як двойчы два: выбараў не будзе — дэпутатаў зноў будуць прызначаць. У нас ёсць час да канца года; гэта апошняя надзея спыніць працэс выпаўзання за рамкі прававога поля. Калі да канца года гэта не ўдаецца — тады дамінантай становіцца байкот: байкот усіх кампаній, якія прапануе ўлада, байкот самой улады, байкот шмат чаго», — лічыць Лябедзька.

Але ўсё ж паўстае пытанне: адкуль узяць грошы на чарговую перадвыбарчую кампанію? Тут ужо варыянтаў не застаецца: трэба зноўку залезць у паясы ды залазіць грамадзянам у кішэні.

На Магілёўшчыне ўзвядзенне лядовых палацаў у Шклове і Горках прыпынена. Каб завяршыць будаўніцтва, патрэбныя мільярды рублёў, якіх у бюджэце няма.

У Шклове лядовы палац пачалі будаваць паўтара гады таму. Кошт будоўлі ў цэнах другога квартала 2010 года ацэньваўся ў 50 мільярдаў рублёў. Завяршыць будаўніцтва лядовай арэны планавалі ў 2011 годзе. Як сцвярджаюць жыхары райцэнтра, гэтай урачыстасці пакуль не будзе. У Горках — сталіцы «Дажынак-2012» — сітуацыя такая ж.

Кошт праезду ў грамадскім транспарце Мінска да канца бягучага года можа быць павышана да 1850 рублёў. Пра гэта заявіў старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька 19 кастрычніка на пасяджэнні мэрыі. «У Мінску неабходна павышаць кошт праезду да канца года ў два разы — да 1850 рублёў», — сказаў мэр сталіцы.

Здаецца, Ладуцька дагуляўся ў жаданні спадабацца ўсім. Нагадаем, што ў сталіцы з 13 верасня студэнтам і навучэнцам дзённай формы навучання ўстаноў горада Мінска, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, прадастаўлена права бясплатнага праезду.

То бок, спачатку праезд быў для іх платны, зараз — бясплатны, а іншым кошты падымаем. Трэба разлічваць свае сілы, спадар Ладуцька!

Але няма горшага без лепшага. З 11 кастрычніка павялічана парогавая сума грашовых сродкаў, што атрымліваюцца ў якасці замежнай бязвыплатнай дапамогі, якая не падлягае рэгістрацыі ў Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі прэзідэнта Беларусі.

Як паведамляе афіцыйны сайт Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці, з 11 кастрычніка 2011 года набыла моц пастанова Кіраўніцтва справамі прэзідэнта ад 26 верасня 2011 года № 10 «Аб унясенні змяненняў у Інструкцыю аб парадку рэгістрацыі, уліку, атрымання і выкарыстання замежнай бязвыплатнай дапамогі». У адпаведнасці з дакументам, са 100 да 500 базавых велічынь павялічаны памер замежнай бязвыплатнай дапамогі, атрыманай фізічнымі асобамі шляхам банкаўскіх і паштовых пераводаў, якая падлягае ўліку ў Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці без афармлення пасведчання аб рэгістрацыі гэтай дапамогі.

То бок, калі раней грамадзянін мог атрымаць гуманітарную дапамогу толькі 3,5 мільёна ў месяц, то зараз — 17,5 мільёна.

Ну і застаюцца рэшткі «фамільнага срэбра». Неабходныя дакументы для продажу «Газпраму» 50% акцый «Белтрансгаза» падрыхтаваныя, паведаміў кіраўнік Дзяржкаммаёмасці РБ Георгій Кузняцоў. «Магчыма, у лістападзе будзем прадаваць пакет акцый «Белтрансгазу», — сказаў ён, нагадаўшы, што цана $2,5 мільярда задавальняе абодва бакі.

Паводле яго слоў, дэлегацыя, якая знаходзіцца ў Маскве, завяршае перамоўны працэс з «Газпрамам». «Па дамове куплі-продажу ўсе пытанні знятыя. Засталіся пытанні па міжурадавым пагадненні», — паведаміў Кузняцоў. Ён не выключыў, што Беларусь ужо ў лістападзе атрымае грошы за «Белтрансгаз».

Разам з тым, як адзначаюць знаёмыя з ходам перамоўнай крыніцы, «Газпрам» будзе аплачваць дзяржпакет акцый «Белтрансгаза» трыма траншамі. Якраз пад выбары апошні транш атрымаем.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ТАЦЦЯНА КАСАТАЯ



У Гродна выключылі з аспірантуры ўніверсітэта імя Янкі Купалы Таццяну Касатую, якая брала актыўны ўдзел у кампаніі «Гавары праўду!». У Гродзенскім універсітэце кажуць, што такога выпадку ніколі не было: кіраўнік навуковай працы заўжды падтрымлівае свайго аспіранта, бо зацікаўлены ў абароне яго дысертацыі. Прафесар Валеры Чарапіца, які таксама прагаласаваў за выключэнне, сказаў, што яму сорамна, што Таццяна Касатая ў яго навучалася. Ён дадаў, што ўзняў высока «планку», якой яна не дасягнула, і што яе справаздача не адпавядае ўзроўню аспіранцкай працы.

Таццяна Касатая прапанавала скласці камісію, якая б магла бесстаронна прачытаць і прааналізаваць яе працу. Гэтай праблематыкай на факультэце ніхто не займаецца. Яе тэма — «Евангельскія хрысціяне-баптысты ў БССР: 1944–1991 гг.». Але гэтую прапанову не пачулі.

Іншых шэсць аспірантаў, апроч Таццяны Касатай, атэставалі. Упершыню ў аўдыторыю не запрасілі іх усіх, а выклікалі паасобку. Апошняй была Таццяна. Раней яна не прайшла атэстацыю на кафедры гісторыі славянскіх дзяржаваў. Паводле слоў Касатай, перад тым прафесар Чарапіца прапанаваў ёй добраахвотна напісаць заяву і звольніцца з аспірантуры, папярэдзіўшы, што атэстацыю яна не пройдзе. Яшчэ раней з Таццянай Касатай не працягнулі кантракт у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі, дзе яна працавала.

### АНАСТАСІЯ ХАРЛАНАВА



21-гадовая гамяльчанка Анастасія Харланава будзе ўдзельнічаць ад Беларусі ў міжнародным конкурсе «Міс свету–2011», фінал якога адбудзецца ў Лондане 6 лістапада.

Анастасія Харланава — другая віцэ-міс конкурсу «Міс Беларусь–2010», студэнтка 5-га курса факультэта машынабудавання Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога. У фінале «Міс свету» будуць браць удзел 122 дзяўчыны з розных краін. Для конкурсу «Міс талент» гомельская студэнтка падрыхтавала фартэпіянны твор Бетховена "Да Элізы».

Анастасія, паводле яе слоў, паспрабуе скарыць гледачоў шоў і журы абаяльнай усмешкай і сціпласцю. Намеснік старшыні Гомельскага гарвыканкама Алена Клічкоўская зазначыла, што работнікі выканкама праглядалі фота астатніх удзельніц конкурсу прыгажосці і прыйшлі да высновы, што «прыгажэйшай за Анастасію там няма». Клічкоўская звярнула ўвагу на зялёныя вочы ўдзельніцы. «Мы адпраўляем яе як Папялушку ў Вавілонскае стоўпатварэнне. У Анастасіі славянская, ненавязлівая і невульгарная прыгажосць», — зазначыў прарэктар універсітэта Віктар Кірыенка.




### ФУТБОЛЬНЫ КЛУБ «ВЕДРЫЧ–97»

Рэчыцкі футбольны клуб «Ведрыч–97» адмовіўся ад гульні ў чэмпіянаце Беларусі з той прычыны, што гульцы не атрымлівалі заробак. Гульня 25-га тура чэмпіянату Беларусі па футболе ў першай лізе паміж камандамі «Хімік» (Светлагорск) і «Ведрыч–97» (Рэчыца) не адбылася. Тэхнічная параза з лікам 3:0 была залічана рэчыцкай камандзе, бо яна не прыехала на матч.

Як паведамляецца на сайце ФК «Ведрыч–97», клубам было прынята рашэнне байкатаваць гульню. «Пайшоў ужо 3-ці месяц з тых часоў, калі гульцы нашай каманды апошні раз атрымлівалі зарплату. Адсюль і такія вынікі ў апошні час. Урэшце цярпенне ў нашай каманды лопнула. Па рэгламенце «Ведрыч–97» будзе залічана тэхнічнае паражэнне з лікам 3:0. Клуб просіць прабачэння ў балельшчыкаў, якія адправіліся ў Светлагорск падтрымаць нашу каманду. Спадзяемся, яны зразумеюць нашу сітуацыю...» — гаворыцца ў паведамленні.

У рэчыцкім райвыканкаме адзначылі, што клуб атрымлівае заробак выключна за кошт спонсарскай дапамогі. У самім клубе БелаПАН паведамілі, што генеральны спонсар РУП "ВА «Беларуснафта» пералічыў сродкі для каманды ў аб'ёме леташняй дапамогі. Сёлета гэтых грошай на патрэбы клуба не хапіла з-за рэзкага павышэння коштаў і інфляцыі. Праблемы з выплатай зарплаты пачалі з'яўляцца ў жніўні, тады Рэчыцкі райвыканкам выдаў клубу пазыку. Каб далей падтрымаць каманду, раённыя ўлады звярнуліся да гендырэктара прадпрыемства «Беларуснафта», папрасіўшы аказаць дадатковую дапамогу. Спонсар даў станоўчы адказ, і паміж прадпрыемствам і клубам быў заключаны новы дагавор. Аднак ён быў накіраваны ў канцэрн «Белнафтахім», дзе павінен прайсці ўзгадненне, якое зацягнулася.

ТРЭЦІ СЕКТАР



# АЛЕГ МАНАЕЎ

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Неаднойчы быў сведкам, як вынікі працы зарэгістраванага ў Вільні Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў выклікалі адмоўную рэакцыю і ў апазіцыі, і ва ўлады. Для сацыёлагаў гэта найлепшы паказчык якасці іх працы.**

## Выбар без выбару

Як кажа сам Алег Манаеў, нарадзіўся ён яшчэ пры Сталіне — 3 лютага 1952 года. Адбылося гэта ва Уладзівастоку, таму першыя чатыры гады жыцця ён правёў на беразе Ціхага акіяну. Потым бацькі пераехалі ў Хабараўск.

Менавіта на гэты перыяд прыходзіцца іх развод і новы шлюб маці з ваенным журналістам Аляксандрам Дракахрустам. У 1964 годзе той змяніў *«Суворовский натиск»* на *«Во славу Родины»*, якая не так даўно стала *«Военной газетой»*, а Хабараўск на Мінск. Як вядома, вайскоўцы не абіраюць места жыцця. У тым ліку і ваенныя журналісты.

Праз чатыры гады пасля нараджэння самога Алега ў яго з'явіўся малодшы брат — Юра. Сёння гэта адзін з лепшых палітычных аглядальнікаў радыё «Свабода» Юрый Дракахруст.

На жаль, іх бацькі, вядомага паэта і журналіста Аляксандра Абрамавіча Дракахруста, не стала 14 лістапада 2008 года.

У Мінску Алег Манаеў пайшоў у элітную чацвёртую школу, якая была бліжэйшай за ўсіх да гасцініцы Дому афіцэраў, дзе тады жыла іх сям'я. Побач знаходзіўся той самы «чырвоны дом» — будынак ЦК КПБ. (Пасля путчу ў гэты дом пераbrowsers Вярхоўны Савет, а пасля 1994 года будынак быў заняты пад прэзідэнцкую рэзідэнцыю). Таму цалкам лагічна, што там вучыліся амаль усе нашчадкі тагачасных партыйных бонзаў.

Аднак «ідэалагічна правільнае» асяроддзе ў 1968 годзе не перашкодзіла Алегу Манаеву далучыцца да моладзевага гуртка, які меў дыяметральна супрацьлеглы афіцыйнаму погляд на «пражскую вясну».

Да яго бацькі, які тады працаваў адказным сакратаром газеты *«Во славу Родины»*, нават прыходзілі з папярэджаннем з мясцовага КДБ. Так 16-гадовы юнак упершыню патрапіў у фокус увагі галоўнай спецслужбы СССР. Не абыдзе яго пільнай увагай і беларускае КДБ. І не толькі таму, што, захаваўшы былую сутнасць, нават назвы не змяніць. А таму, што Алег Манаеў заўсёды шукае праўду жыцця. А яна ніколі не падабаецца існуючай уладзе.

## Выбар прафесіі

Маці (на жаль, Дзіна Мікалаеўна таксама пайшла з жыцця тры гады таму) будучага сацыёлага таксама была журналісткай, таму нікога не здзівіла, што такім жа шляхам вырашыў пайсці і Алег Манаеў. У старэйшых школьных класах ён вучыўся на падрыхтоўчых курсах пры факультэце журналістыкі прэстыжнага Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, куды кожны месяц дасылаў свае пісьмовыя работы. Цікава, што ад выбару гэтай прафесіі больш другіх яго адгаворвалі бацькі, бо добра ведалі сутнасць савецкай «чацвёртай улады».

Моладзі ўласціва не слухаць парадаў старэйшых. Алег Манаеў — не выключэнне. У МДУ ў тыя часы адкрылі факультэт міжнароднай журналістыкі. Туды і вырашыў паступаць амбіцыйны (у добрым сэнсе) юнак. Здаў два іспыта, калі высветлілася, што ў яго не хапае «камсамольскага стажу». Чаму на гэта ніхто не звярнуў увагу адразу, патлумачыць можна толькі савецкім бардакам. Альбо невядомай «пільнасцю»…

Экзамены ў МДУ адбываліся раней за астатнія, але ў мінскія ВНУ з іх адзнакамі не ўзялі. Звычайная правінцыйная зайздрасць. Маўляў, мы не горшыя… Выключэннем стаўся толькі педагагічны факультэт Гродзенскага ўніверсітэта. Магчыма таму, што на той час універсітэт быў таксама вельмі малады і таксама вельмі амбіцыйны.

Праз два гады Алег Манаеў перавёўся на журфак БДУ, які і скончыў у 1974 годзе. Зараз, напэўна, працаваў бы ў якім-небудзь СМІ, калі б на пятым курсе не пачаў зноў «шукаць праўду».

Сутнасць «студэнцкага бунту» была ў прапановах унесці карэктывы ў вучэбныя праграмы, якія былі літаральна насычаныя марксіцка-ленінскай ідэалогіяй. Звярнуліся нават да Машэрава і рэдактара «Праўды» Зіміяніна.

У выніку нейкія змены ў навучальны працэс былі ўнесены, але па сутнасці нічога не змянілася. Аднак усім, хто меў дачыненне да «бунту», даволі хутка адпомсцілі. Манаеву гэта каштавала месца ў газеце «Знамя юности». Замест работы па спецыяльнасці ён два гады камандаваў танкавым узводам у лесе пад Любанню.

## Новы выбар

У 1976 годзе яму нарэшце пашанцавала. Яшчэ падчас вучобы на журфаку Алег забягаў слухаць лекцыі па філасофіі, а дыпломную работу напісаў па сацыяльнай псіхалінгвістыцы. Пасля таго, як працаўладкавацца ў газеты не атрымалася, ён звярнуўся да галоўнага сацыёлага Беларусі прафесара Давідзюка. І неўзабаве стаў малодшым навуковым супрацоўнікам Праблемнай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў БДУ.

**І тады пачаў працаваць прынцып: хто не з намі, той супраць нас. Хаця аб'ектыўныя сацыёлагі не выступаюць супраць канкрэтных персон.**

Праз некалькі месяцаў у гэты ж кабінет прыйшлі супрацоўнікі КДБ, аднак у іх нічога не атрымалася. Мабыць, раней кіраўнікі былі больш сумленныя і смелыя, чым сёння…

У 1992 годзе Алег Манаеў абараніў кандыдацкую дысертацыю, а ў хуткім часе і доктарскую. Абедзве звязаныя з праблемамі сродкаў масавай інфармацыі.

Нягледзячы на тое, што ў 1990 годзе Алег Манаеў меў дачыненне да стварэння Аб'яднанай дэмакратычнай партыі, якая праз пяць гадоў аб'ядналася з Грамадзянскай, стаць партыйцам ён не захацеў. Больш за тое, у 1992 годзе быў створаны Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД), які даволі хутка стаў не даспадобы былым паплечнікам, таму што пачаў агучваць лічбы, якія, мякка кажучы, ім не падабаліся.

Тое ж самае можна сказаць і пра ўладу. Пачала яна са спробаў перацягнуць таленавітага сацыёлага на свой бок. У 1988 годзе гэта паспрабавалі зрабіць камуністы, у 1992 — прыхільнікі Кебіча, а ў 1997-м — атачэнне Лукашэнкі. Безвынікова.

І тады пачаў працаваць прынцып: хто не з намі, той супраць нас. Хаця аб'ектыўныя сацыёлагі не выступаюць супраць канкрэтных персон. Яны толькі агучваюць лічбы, ад якіх гэтыя самыя персоны пачынаюць вар'яцець.

## Эфект «неваляшкі»

Гісторыя супрацьстаяння НІСЭПД з дзеючымі беларускімі ўладамі, на мой погляд, пачалася тады, калі тыя зразумелі, што ўзяць пад поўны кантроль прафесара Манаева не атрымаецца. Раздражняла і тое, што, у адрозненне ад некаторых «штатных» апазіцыянераў, ён не падганяе лічбы пад канкрэтныя мэты, а значыць, карыстаецца большым даверам.

І Алега Манаева пачалі «прэсаваць».

У 1997 годзе па ініцыятыве НІСЭПД была створана Беларуская асацыяцыя фабрык думкі, у якую ўвайшлі 18 вядучых недзяржаўных цэнтраў Мінска і большасці рэгіёнаў краіны. У 2006 годзе яе ліквідаваў Вярхоўны суд Беларусі.

У жніўні 2002 года была прынятая Пастанова Савета Міністраў РБ з доўгай назвай — «Аб дзейнасці, звязанай з правядзеннем даследаванняў і публікацыяй вынікаў апытанняў грамадскай думкі, што тычацца грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне, рэспубліканскіх рэферэндумаў і выбараў».

Сутнасць яе зводзілася да вельмі простага: каб мець магчымасць праводзіць у Беларусі любыя сацыялагічныя даследаванні, трэба было атрымаць адпаведную акрэдытацыю. Права на выдачу акрэдытацыі было ўскладзена на створаную ўладай спецыяльную камісію, кіраўніком якой быў прызначаны «свой чалавек» Ігар Катляроў. Многія расцанілі гэта як увядзенне прымітыўнай цэнзуры.

З верасня па лістапад 2004 года НІСЭПД атрымаў аж восем (!!!) лістоў з Мінюсту з прэтэнзіямі, якія больш нагадвалі звычайныя прыдзіркі. 13 снежня 2004 года супрацоўнікі КДБ абшукалі кватэру намесніка Алега Манаева, кандыдата эканамічных навук і былога першага міністра працы Аляксандра Саснова.

Пасля яшчэ неадночы былі пераследы з боку ўлады, якія скончыўся тым, што 15 красавіка 2005 года НІСЭПД з дапамогай Вярхоўнага суда Беларусі ліквідавалі. За што? Можна пералічыць афіцыйныя фармулёўкі, але, я думаю, — «ты виноват лишь тем, что хочется мне кушать».

Я не аднойчы пісаў, што, некаторыя арганізацыі тых часоў нагадвалі дзіцячыя лялькі-неваляшкі. Дзяржава «нахіляе», а яны зноў паўстаюць у поўны рост. Так адбылося і з НІСЭПД.

Адразу пасля беларускай ліквідацыі з'явілася літоўская рэгістрацыя. Інстытут з гэтага моманту ўзначаліў доктар філасофіі Альгірдас Дэгуціс, а старшынёй Наглядальнага савету стаў доктар юрыдычных навук, прафесар Рэмігіюс Шымашус.

Беларускія ж сацыёлагі працягнулі працу як незалежныя эксперты. Так бы мовіць, прыватным чынам. У РБ з'явілася добра вядомая «група прафесара Манаева», куды акрамя Алега Цімафеевіча ўваходзіць узгаданы вышэй Аляксандр Сасноў і паважаны аўтар нашай газеты Сяргей Нікалюк.

## Небяспечныя вынікі

Заўсёды ведаў, што лічбы сапраўдных сацыёлагаў могуць не падабацца, але ніколі не думаў пра верагоднасць такога перапалоху.

Каля трох месяцаў таму Алега Манаева паспрабавалі зволіць (за паўгады да пенсіі) з БДУ, дзе ён зараз чытае курс лекцый. Не атрымалася, бо за беларускага сацыёлага ўступіліся многія сусветна вядомыя і ўплывовыя навукоўцы. 121 чалавек з 28 краін свету.

Урэшце пасля такой нечаканай бурнай рэакцыі нехта вырашыў пайсці ў «лабавую атаку», якая па арыгінальнасці нагадвала вынікі непаспяховай лабатаміі.

Пасля таго, як у пачатку кастрычніка 2011 года былі надрукаваныя дадзеныя аб рэкордным падзенні рэйтынга прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, 6 кастрычніка ў 15.00 Алег Манаеў на тры гадзіны быў затрыманы міліцыянтамі. Ён накіроўваўся ў польскую амбасаду, дзе павінен быў адбыцца штокварталыны брыфінг для дыпламатычнага корпусу краін Еўрасаюза.

Для тых, хто не памятае, узгадаю, што праводзіцца брыфінгі з моманту заснавання інстытута (1992), а пасля ліквідацыі НІСЭПД (2005 год), у сувязі з адсутнасці магчымасці правесці іх на якой-небудзь айчыннай пляцоўцы (не даюць), незалежных сацыёлагаў слухаюць у замежных амбасадах, дзе беларуская юрысдыкцыя не дзейнічае.

Як адзначыў першы сакратар польскай амбасады Павел Марчук, сярод замежных дыпламатаў на брыфінгі «групы прафесара Манаева» з-за іх папулярнасці існуе чарга, і таму цалкам натуральна, што сарванае беларускімі «цэрберамі» мерапрыемства адбылося ў польскай амбасадзе літаральна праз два дні.

Здагадкі пра тое, што, хто і каму хацеў даказаць, пакінем за дужкамі. Асабіста я не бачу тут разумнай логікі, а скончыць нарыс хачу адной прымаўкай — паглядзіся на ваду, якога ты роду…

КРЭДЫТЫ

# БУДАЎНІЦТВА АДКЛАДВАЕЦЦА

Вольга ХВОІН

**З кастрычніка ААТ «АСБ Беларусбанк» прыпыніў ільготнае крэдытаванне. Крэдытныя дамовы на прадастаўленне льготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) жылых памяшканняў па аб'ектах, што ўводзяцца ў эксплуатацыю ў 2012 годзе і наступных гадах, заключацца не будуць. Разам з тым скараціліся аб'ёмы будаўніцтва жылля.**

Па загаду ўрада «Беларусбанк» з 10 кастрычніка спыніў льготнае крэдытаванне будаўніцтва дамоў, якія плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ў 2012–2013 гадах. Згодна з пратаколам пасяджэння Савета Міністраў №41 ад 27 верасня 2011 года, на аснове якога і было прынята рашэнне Беларусбанка, калі эканамічная сітуацыя ў краіне застанецца нявызначанай, магчыма далейшае «замарожванне» крэдытных выплат. У выніку беларусы, якім банк па дамове мусіў пералічваць грошы на працягу трох месяцаў да канца 2011 года пасля прынятага банкам рашэння, іх не атрымаюць. З-за штомесячнай індэксацыі іх кватэры істотна падаражэюць, але розніцу ў кошце грамадзянам давядзецца аплачваць за свой кошт.

Мінчанам адмовілі ў льготных крэдытах на будаўніцтва жылля яшчэ летам. Аляксандр Лукашэнка ў чэрвені заяўляў, што льготнае крэдытаванне ў Беларусі захаваецца, але яго аб'ёмы скароцяцца. Ён таксама даручыў за паўгода стварыць новую сістэму льготнага крэдытавання насельніцтва, вызначыўшы ў ёй катэгорыі грамадзян, якім будуць дадзены такія крэдыты. Акрамя таго, сваім указам ад 9 жніўня Аляксандр Лукашэнка знізіў крытэрый патрэбнасці ў жыллі ў Мінску на аднаго чалавека да 10 квадратных метраў. Па стане на 1 кастрычніка 2011 года на льготнае крэдытаванне жыллёвага будаўніцтва банкам па ўзгадненні з аблвыканкамам і Мінгарвыканкамам накіравана 5,4 трыльёна рублёў, або 69% ад зацверджанага гадавога аб'ёму.

Цяпер крэдытныя грошы не атрымаюць не толькі тыя, хто не паспеў аформіць крэдыт. Прыпыненыя выплаты і для тых, хто ўжо чакаў пераводу грошай. У няпростай сітуацыі апынуліся як сем'і, што чакалі жытла, так і забудоўшчыкі.

Таксама сёлета назіраецца скарачэнне аб'ёмаў будаўніцтва жылога фонду. За дзевяць месяцаў гэтага года ў Беларусі арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 48,7 тысячы новых кватэр, за аналагічны перыяд мінулага года пабудавалі 62,4 тысячы кватэр. Па дадзеных Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у эксплуатацыю было ўведзена больш як 3,9 мільёна квадратных метраў жылплошчы (52,3% да гадавога плана), гэта значыць на 20,5% менш, чым у мінулым годзе.

У сельскай мясцовасці за названы перыяд увялі ў эксплуатацыю 970,5 тысячы квадратных метраў агульнай жылплошчы. У параўнанні з аналагічным леташнім перыядам гэты паказчык скараціўся на 24,2%.

Цяпер праводзіцца работа па распрацоўцы асноўных напрамкаў жыллёвай палітыкі Рэспублікі Беларусь, у прыватнасці Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь распрацаваны праект Указа прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва Указ прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14.04.2000 №185, якім прадугледжваецца аптымізацыя ўмоў прадастаўлення грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі ў выглядзе льготнага крэдыту на будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыццё жылля, а таксама прапануецца аптымізаваць сістэму па вылучэнню катэгорый грамадзян з ліку найбольш сацыяльна ўразлівых і сацыяльна значных грамадзян, якія маюць права прэтэндаваць на атрыманне льготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў.

Сітуацыя ў эканоміцы паўплывала і на даступнасць крэдытаў. Стаўка рэфінансавання цяпер складае 35% гадавых. Стаўкі па крэдытах у беларускіх рублях дасягаюць 75% гадавых.

І, калі крэдыты, з разлікам сваіх магчымасцяў, можна і не браць, дык аддаваць іх давядзецца незалежна ад таго, упалі ці выраслі даходы. Паводле інфармацыі Нацыянальнага банка, у кастрычніку ў Беларусі рэзка вырасла колькасць праблемных крэдытаў, выдадзеных фізічным асобам у рублях. На 1 кастрычніка праблемная запазычанасць дасягнула 92 900 000 000 рублёў. З пачатку года іх аб'ём павялічыўся ў 2,6 разы, толькі за верасень — на 11%.

Праблемная валютная запазычанасць беларусаў на 1 кастрычніка склала 20 600 000 долараў. З пачатку года яна знізілася на 5,1%. На 1 кастрычніка беларусы застаюцца вінныя банкам яшчэ 288 000 000 долараў, ці на 53,4% менш, чым у пачатку года.

У той жа час аб'ём крэдытавання фізічных асоб у рублях за дзевяць месяцаў гэтага года вырас на 33,6. Па стане на 1 кастрычніка аб'ём выдадзеных крэдытаў дасягнуў 28 200 000 000 000 рублёў.

Яшчэ вясной эксперты міжнароднага агенцтва Moody's прагназавалі шматразовае павелічэнне долі праблемных крэдытаў у Беларусі. Аналітыкі агенцтва звязвалі гэта з імклівай дэвальвацыяй рубля.



http://brocompany.by

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# РУБЕЛЬ І ДОЛАР НА АРЭЛЯХ



**Няма недахопу ў прагнозах наконт таго, якім будзе адзіны курс белрубля да долара пасля звядзення дзвюх сесій продажу валюты ў адну. На думку Аляксандра Лукашэнкі, долар абваліцца, а рубель узляціць. Як на арэлях. Але калі ўзляціць, ці надоўга затрымаецца?**

Паводле Лукашэнкі, цяперашні высокі курс долара свядома падтрымліваўся. Бо ў асноўным заяўкі на долары рабілі так званыя індывідуальныя прадпрымальнікі і тыя, хто ўвозіць у краіну тавары некрытычнага імпарту. Дык навошта ім прадаваць танны долар?

На самай справе, навошта? Хай купляюць дарагую вопратку, абутак, касметыку ды іншыя дробязі, каб з імі магла канкурыраваць прадукцыя беларускіх прадпрыемстваў. А кошты на яе ўжо такія, быццам яны цалкам выпрацоўваюцца з імпартнай сыравіны работнікамі з сярэдненеўрапейскімі заробкамі. А што да крытычнага імпарту, то і тут не ўсё проста. Прыкладам, марская рыба, крытычна неабходная для здаровага харчавання ў любым узросце, паставіла рэкорды росту коштаў. Увогуле, за што ні вазьміся ў спажывецкім кошыку, набор якога з'яўляецца і абавязковым, і адначасова мінімальным, амаль па кожнай пазіцыі адбылося вельмі значнае падаражанне.

Цэны ўзнесліся ўверх, рубель зваліўся ўніз. А долар быў тут нават і не пры чым, як заўжды, стаяў збоку і маўкліва назіраў за эканамічным ды сацыяльным курсам беларускага ўрада ды Нацыянальнага банка. Бо на самай справе долар у нас ёсць умоўнай адзінкай. Дзякуючы сваёй адноснай устойлівасці ў доларах вымяраюцца колькасныя паказчыкі нашай эканомікі. Прыкладам, заробкі беларусаў у рублях значна павысіліся, а ў доларах зменшыліся ў тры разы.

Дарэчы, рубель таннеў не толькі адносна долару, але і адносна амаль любой валюты, уключна нават самыя экзатычныя. Тыя, пра якія мы нічога не ведаем і не будзем ведаць. Дэвальвацыя нацыянальнай грашовай адзінкі па-сутнасці ёсць дэфолтам, адмовай урада выконваць свае абавязацельствы перад насельніцтвам. Прыкладам, устанавілі параметры гадавой інфляцыі, прынялі іх дзвюма палатамі ў якасці закона. І на табе! У такіх выпадках аматары дваровага футбола казалі брамніку-недарэку: «Калі мячы трымаць не можаш, то патрымай мой макінтош».

Зразумела, калі ёсць магчымасць купляць долары па кошце ў два-тры разы меншым за рэальны, дык можна і не працаваць. Тым больш, што «падманутыя дзяржаўнай пірамідай укладчыкі» дазваляюць сябе ж вінаваціць, бэсціць і несці адказнасць за найдрабнейшы супраціў бязмежнаму дзяржаўнаму фіскальству.

Ад гэтага пацярпелі і прадпрыемствы-экспарцёры, якіх змушалі прадаваць частку валютнай выручкі па выгаднаму для ўладаў курсу. Але ў тых магчымасцяў для карэктыроўкі ўрадавага курса больш, чым у насельніцтва. Яны не змушалі сваіх замежных партнёраў як мага хутчэй разлічвацца за пастаўленыя тавары і паслугі, яны не пратэставалі супраць павелічэння дэбіторскай запазычанасці. А магчыма, і наадварот, спрыялі яе росту.

У выніку легальныя валютныя паступленні ў Беларусь дайшлі амаль што да нуля. А ўлада ўрэшце зразумела, што нічога добрага з гэтага не атрымаецца.

І, як заўжды, Лукашэнка папулярна тлумачыць усім, хто змушаны яго слухаць, чаму, на яго думку, не павінны больш значна павялічвацца кошты харчовых прадуктаў. Маўляў, кошты ўжо ўперліся ў спажывецкі попыт насельніцтва, і таму не могуць расці так хутка, як раней. І таму не слухае нейкіх шматлікіх дарадчыкаў, які заклікаюць да жорсткай адміністрацыйнай забароны падвышэння спажывецкіх коштаў. Бо калі замарозіць цэны на малако, мяса, то ад гэтага пацерпяць заробкі сялян. З улікам гэтага, лічыць Лукашэнка, да яго нельга прад'яўляць прэтэнзіі па нейкіх цэнавых фактарах. Мусіць, лічыць, што зрабіў усё, што мог, каб было лепей. І лейцы нікому не збіраецца аддаваць. Абяцае, што далей увогуле будзе лепей. Нават нягледзячы на тое, што жывем у нейкім ажыятажна-крызісным свеце, калі на яго паглядзець з Беларусі вачамі прэзідэнта і шараговага беларуса. І, паглядзеўшы, парадавацца, што мы ўжо ўсё гэта пераЖылі. Гэта беларусам плюс. Яны прайшлі і вытрымалі. А ў астатніх, маўляў, усё яшчэ наперадзе, у тым ліку і выдаткі.

Так-то яно так, але ёсць нюансы. Фактычна беларусы, набыткам якіх усе гэтыя дзеянні нанеслі велізарныя страты, павінны маліць Бога, каб «у астатнім свеце» на самай справе не здарылася якіх катаклізмаў. Бо Еўрасаюз у такім выпадку не зможа даць Беларусі ніводнага еўра. Нават калі ў краіне ўсталюецца сапраўдная дэмакратыя. Ніхто не дасць: ні Расія, ні адна іншая краіна… Паколькі сусветная эканоміка па ўзроўню ўзаемных сувязяў намнога пераўзыходзіць так званую беларускую мадэль.

ЗАКАНАДАЎСТВА

# СІЛАВІКІ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ НА ПАСТАЎЛЕНУЮ МЭТУ

Вольга ХВОІН

**3 кастрычніка 2011 года Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь быў ухвалены праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і зменаў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь». Юрысты б'юць трывогу: папраўкі ў заканадаўства ўводзяць у прававое поле практыку абмежавання, забароны і рэпрэсій.**

Праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і зменаў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь» уносіць змены і дапаўненні ў шэраг заканадаўчых актаў: Закон Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях», Закон Рэспублікі Беларусь «Аб палітычных партыях», Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы, Выбарчы кодэкс, Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях.

Змены і дапаўненні, прапанаваныя да ўнясення ў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, прааналізавалі праваабаронцы і эксперты ў сферы НДА. Прыводзім вытрымкі з аналітычнай запіскі.

## Пакаранне за бяздзеянне

Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ўжо ўхвалены праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь». Эксперты мяркуюць, што ўрад унёс гэты праект на разгляд у парламент пасля шэрагу вулічных акцый пратэсту, якія адбыліся цягам апошняга года.

Нормы зменаў закранаюць як парадак арганізацыі масавага мерапрыемства, так і парадак удзелу ў ім. Цяпер любы факт сумеснай прысутнасці грамадзян у загадзя абумоўленым месцы ўтварае склад правапарушэння, звязанага з парушэннем парадку правядзення і ўдзелу ў масавым мерапрыемстве. Характэрным ёсць дадатковае ўключэнне ў склад магчымых прыкмет пікету арганізацыю збору грамадзян праз інтэрнэт альбо іншыя інфармацыйныя сеткі.

Уводзіцца абмежаванне для асоб, якія прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў: на працягу года пасля адміністрацыйнага спагнання яны не могуць быць арганізатарамі масавага мерапрыемства. То бок можна гаварыць аб стварэнні практыкі паразы ў правах.

Забараняецца да атрымання дазволу на правядзенне масавага мерапрыемства, якое можа быць выдадзена дзяржаўным органам толькі за пяць дзён да даты мерапрыемства, распаўсюджваць у глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт або іншых інфармацыйных сетках інфармацыю аб даце, месцы і часе яго правядзення.

## Замежную дапамогу ў казну

Змены ў заканадаўства аб палітычных партыях, грамадскіх аб'яднаннях і замежнай бязвыплатнай дапамозе прадугледжваюць забараніць «дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў, [і іх] саюзаў, накіраваную на садзеянне прадастаўленню замежнымі дзяржавамі грамадзянам Рэспублікі Беларусь ільгот і пераваг у сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі або нацыянальнай прыналежнасцю ў парушэнне заканадаўства». Праваабаронцы мяркуюць, што гэтая норма ўносіцца ў заканадаўства ў якасці меры рэалізацыі меркавання Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь наконт «карты паляка». Аднак норма закранае ў тым ліку рэлігійныя, этнічныя арганізацыі.

Магчыма, будзе значна зменены парадак прадастаўлення, выкарыстання замежнай бязвыплатнай дапамогі. Прадугледжвацца ўвесці дадатковыя абмежаванні для атрымання фінансавання палітычнымі партыямі. Робіцца значна больш жорсткай адказнасць за парушэнне парадку атрымання замежнай бязвыплатнай дапамогі.

Поруч з абмежаваннем замежнага фінансавання палітычных партый прапануецца абмежаваць і атрыманне грашовых сродкаў у выбарчыя фонды.

Яшчэ адна важная дэталь: пашыраны пералік мэтаў, на якія не можа быць выкарыстаная замежная дапамога. Асабліва трывогу праваабаронцаў выклікае факт таго, што ў склад як адміністратыўнай, так і крымінальнай адказнасці ўключана атрыманне, захоўванне і перамяшчэнне замежнай бязвыплатнай дапамогі для фінансавання правядзення любых семінараў, без вызначэння іх мэты і тэматыкі.

## Змены ў заканадаўства аб спецслужбах

Змены ў закон «Аб органах дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь» павялічваюць аб'ём правоў органа дзяржаўнай бяспекі, пашыраюць парадак прымянення яго супрацоўнікамі фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў, зброі, баявой і спецыяльнай тэхнікі.

Органам дзяржаўнай бяспекі прадстаўляецца права ўваходзіць бесперашкодна, пры неабходнасці з пашкоджаннем замыкаючых прыладаў і іншых прадметаў, у любы час сутак у жыллё або іншыя законныя ўладанні фізічных асоб, у памяшканні дзяржаўных органаў і іншых арганізацый. Новая рэдакцыя закона зрабіла неабавязковым паведамляць пракурору пра парушэнні недатыкальнасці жылля, што, безумоўна, можа негатыўна ўплываць на ступень абароненасці названага права. Агулам аб'ём гэтага права адпавядае правам супрацоўніка органа ўнутраных спраў, замацаванага Законам Рэспублікі Беларусь «Аб органах унутраных спраў Рэспублікі Беларусь».

Да новых правоў органа дзяржаўнай бяспекі можна аднесці права ажыццяўляць пры праходзе (праездзе) на ахоўныя аб'екты органаў дзяржаўнай бяспекі і пры выхадзе (выездзе) з такіх аб'ектаў асабісты дагляд фізічных асоб, дагляд іх рэчаў, дакументаў, транспартных сродкаў і рэчаў. Пры адсутнасці якіх-небудзь абмежаванняў можна выказаць здагадку, што адвакаты, якія наведваюць СІЗА КДБ, могуць быць падвергнутыя названым працэдурам (асабісты дагляд, дагляд рэчаў, дакументаў). Відавочна, што пры гэтым будуць парушаныя правы на незалежнасць адваката і забеспячэнне адвакацкай тайны.

Значныя змены зведалі палажэнні аб ужыванні супрацоўнікамі органа дзяржаўнай бяспекі зброі і спецыяльных сродкаў. Цяпер аб'ём паўнамоцтваў супрацоўніка органаў дзяржаўнай бяспекі практычна ідэнтычны вызначанаму для супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, органаў фінансавых расследаванняў, ваеннаслужачых унутраных войскаў. Аднак дaследаваны закон, як і законы, якія рэгулююць дзейнасць пералічаных органаў, утрымлівае адкрыты пералік выпадкаў, калі супрацоўнікам органа могуць быць ужытыя спецыяльныя сродкі, зброя, баявая і спецыяльная тэхніка, прадугледжваючы яе прымяненне і «ў іншых выпадках, вызначаных Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь».

Прапануецца ўнесці папраўкі, паводле якіх супрацоўнік органаў дзяржаўнай бяспекі не нясе адказнасці за шкоду, прычыненую ў сувязі з ужываннем фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў, баявой і спецыяльнай тэхнікі, ужываннем (выкарыстаннем) зброі ў прадугледжаных гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі выпадках.

Пры гэтым новы законапраект прапануе выкласці артыкул 19 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб органах дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь» у новай рэдакцыі: «Супрацоўнікі органаў дзяржаўнай бяспекі маюць права на абгрунтаваную прафесійную рызыку. Прычыненне імі шкоды пры абгрунтаванай прафесійнай рызыцы не ёсць правапарушэннем. Прафесійная рызыка прызнаецца абгрунтаванай, калі здзейсненае супрацоўнікам органаў дзяржаўнай бяспекі дзеянне аб'ектыўна вынікала з наяўнай сітуацыі, а пастаўленая мэта не магла быць дасягнута не звязанымі з рызыкай дзеяннямі і супрацоўнік органаў дзяржаўнай бяспекі, які дапусціў прафесійную рызыку, прыняў усе магчымыя меры для прадухілення шкоды». У дадзеным выпадку заканадаўца ў азначэнні падставы для прафесійнай рызыкі замяняе паняцце «законнай мэты» на паняцце «пастаўленай мэты», што карэнным чынам змяняе змест паняцця прафесійнай рызыкі. У новай праўнай канструкцыі падставай для вызвалення супрацоўнікаў органаў дзяржаўнай бяспекі ад адказнасці за шкоду, прычыненую іх дзеяннямі, ёсць не закон, а бягучая мэтазгоднасць і загад.

Такім чынам, праект закону стварае перадумовы для парушэння правоў грамадзян на недатыкальнасць жылля і іншых законных уладанняў грамадзян, а таксама свабоду, недатыкальнасць і годнасць асобы.

**Паводле Аналітычнай запіскі беларускіх праваабаронцаў http://spring96.org**

КАМЕНТАР

## ПОЛЕ ДЗЕЙНАСЦІ ВЕЛІЗАРНАЕ

**Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька лічыць, што папраўкі ў заканадаўства, якія рыхтуе ўлада, скіраваныя супраць любой актыўнасці.**



— Гарантыі, што гэтыя папраўкі ў заканадаўства не будуць выкарыстаныя супраць іх, маюць толькі 2–3 працэнта грамадзян Беларусі. Поле дзейнасці велізарнае. Яны датычацца не толькі апазіцыі, бо скіраваныя супраць любой актыўнасці, грамадзянскай пазіцыі, якая можа быць практычна ў кожнага. Калі заўтра, напрыклад, на прадпрыемстве ўзнікне складаная сітуацыя, то гэты закон можа быць скарыстаны супраць людзей, якія б захацелі нешта зрабіць, хаця яны і не ўваходзяць у палітычныя партыі, арганізацыі. Калі нехта думае, што гэта яго не тычыцца, то глыбока памыляецца.

Дэ-факта супраць нас гэта і так дзейнічае, без папраўак. Я асабіста жыву па такому заканадаўству са снежня мінулага года. Спроба ўнесці змены ў заканадаўства дае магчымасць палітычным структурам узняць дыскусію аб эфектыўнасці структур, што прымаюць такое заканадаўства. Цяпер сітуацыя больш абвостраная, і людзі будуць адэкватна ўспрымаць такую інфармацыю. І важна, каб стала зразумела, што дэпутаты ў парламенце мусяць быць сапраўды абраныя, а не прызначаныя. Будзем, безумоўна, тлумачыць людзям, з чым яны могуць сутыкнуцца ў сваім жыцці, калі закон будзе мець такі выгляд.

## 26 КАСТРЫЧНІКА, СЕРАДА

**06.00, 07.05, 08.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**07.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтарэсаў».
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**10.05** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**11.00** Меладраматычны серыял «Разумніца, прыгажуня» (Расія). Заключная серыя.
**12.10** Псіхалагічная драма «Меншы сярод братоў» («Беларусьфільм»). 1- я серыя.
**13.50** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**14.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультфільм «Ну, пачакай!».
**15.55** «Дочкі маёй вочы». Відэафільм.
**16.40** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**17.45** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна-Расія). 1-я серыя.
**18.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Рамантычная камедыя «Даверся мужчыну» (ЗША).
**23.50** Дзень спорту.
**00.05** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

**06.00, 09.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** Прэм'ера. «Паляўнічыя за дыяментамі». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Прэм'ера. «Шчаслівыя разам». Шматсерыйны фільм.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Паляўнічыя за дыяментамі». Шматсерыйны фільм. Закл. серыя.
**22.20** Прэм'ера. «Зняволены». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**23.20** Асяроддзе пасялення.
**00.20** «След».
**01.40** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Механік». ЗША, 2010 г.
**10.40** «Прагнасць».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**16.50** « Прыгоды дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Мінулай ноччу ў Нью-Йорку». ЗША-Францыя, 2009 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Мінск і мінчане».
**23.30** «Дабро пажаліцца».
**23.55** «Хірамант». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**10.05** Альбарутэнія.
**10.40** Канцэрт Tom Jonnes. Live in Cardiff Castle.
**11.45** Рэальны свет.
**12.20** Спорт-кадр.
**12.50** Дэтэктыў «Задача з трыма невядомымі» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**15.15** Жаночая ліга.
**16.15** Медычныя таямніцы.
**16.50** Баявік «Замах». 3-я серыя.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Баскетбол.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Спортлато 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** «Беларуская часіна».
**22.35** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**23.35** Рэальны свет.
**00.05** Баявік «Замах» (Беларусь-Расія). 3-я серыя.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Бумеранг з мінулага».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Бумеранг з мінулага».
**23.25** Тэлесерыял «Я цябе ніколі не забуду».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** «Гістарычны працэс».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.25** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Серыял «Сталіца граху».
**00.30** Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**09.45** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Агляд.
**10.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**10.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**11.45, 15.00, 01.00** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Групавы этап. Стамбул (Турцыя).
**13.15** Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). Дзень 3-і.
**17.00** Live. Тэніс. Чэмпіянат WTA. Групавы этап. Стамбул (Турцыя).
**22.50** Абранае па серадах.
**22.55** Конны спорт. Кубак свету. Канкур. Хельсінкі (Фінляндыя).
**23.55** Навіны коннага спорту.
**00.00** Гольф. Турнір Castello Masters.
**00.30** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.35** Абранае па серадах.
**00.50** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.55** Спартовае вандраванне. Гольф. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Арол», серыял: 13 серыя.
**08.30** Два на два (тэледыскусія).
**09.00, 13.40** «Тры шалёныя нулі», серыял: 5 серыя.
**09.25, 13.10** На колах.
**09.55, 16.20** Рэпартэр.
**10.20** Сальда (эканамічная праграма).
**10.35, 15.35** Госць «Белсату».
**10.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.05** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**11.20** «Гняздо», серыял: 8 серыя.
**12.10** «Арол», серыял: 13 серыя.
**14.05** Эксперт.
**14.30** Сальда (эканамічная праграма).
**14.50** Два на два (тэледыскусія).
**15.15** «Старадаўнія інструменты Беларусі», дак. фільм, 2007 г., Беларусь: ч. 1.
**15.50** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**16.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.45** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**17.00** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 5 серыя.
**17.30** «Старадаўнія інструменты Беларусі», дак. фільм, 2007 г., Беларусь: ч. 1.
**17.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Прыстань», дэтэктыўны серыял.
**18.45** Вагон.
**18.55** «Прывід з Давыд-Гарадка», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Без рэтушы: «Фядора, якая лечыць», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**21.45** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 12 серыя.
**22.15** Два на два (тэледыскусія).
**22.40** Аб'ектыў.
**23.05** Гарачы каментар.

## 27 КАСТРЫЧНІКА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.05, 08.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.35** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**10.05** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**11.00** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна - Расія). 1-я серыя.
**12.10** Псіхалагічная драма «Меншы сярод братоў» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.
**13.50** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультфільм «Ну, пачакай!».
**15.45** «Божа мой». Дакументальны фільм («Беларусьфільм»).
**16.15** Здароўе.
**16.45** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**17.45** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна-Расія). 2-я серыя.
**18.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** Клуб рэдактараў.
**22.30** Сацыяльная драма «Аднойчы ў правінцыі» (Расія).
**00.45** Дзень спорту.
**01.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** Прэм'ера. «Паляўнічыя за дыяментамі». Шматсерыйны фільм. Закл. серыя.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Шматсерыйны фільм «Чорныя ваўкі».
**23.20** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.50** «Зваротны адлік».
**00.20** «След».
**01.40** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** Фільм «Мінулай ноччу ў Нью-Йорку». ЗША-Францыя, 2009 г.
**10.40** «Зорныя гісторыі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**16.50** «Пяць гісторый».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Давай зробім гэта па-хуткаму». Германія- Францыя - Вялікабрытанія, 2001 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Праўда».
**23.35** «Аўтапанарама».
**23.55** «Хірамант 2». Серыял.
**00.50** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**10.05** Альбарутэнія.
**10.35** Канцэрт Leonard Cohen. Live in London.
**12.05** Рэальны свет.
**12.40** Страсці па культуры.
**13.20** Камедыя «Начныя забавы» (СССР).
**15.20** Жаночая ліга.
**16.20** Медычныя таямніцы.
**16.55** Баявік «Замах». 4-я серыя.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія).
**20.00** Жаночая ліга.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** «Беларуская часіна».
**22.30** Баявік «Замах». 4-я серыя.
**23.30** Час футболу.
**00.10** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.10** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Бумеранг з мінулага».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Бумеранг з мінулага».
**23.25** Тэлесерыял «Я цябе ніколі не забуду».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. «Паядынак».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Таямнічая Расія».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.25** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Серыял «Сталіца граху».
**00.25** Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). 3-і.
**11.00** Конны спорт. Скокі. Агляд тыдня. Часопіс.
**11.30** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Групавы этап. Стамбул (Турцыя).
**13.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate America. Адвольны танец. Эверэт (ЗША).
**14.15** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate America. Мужчыны. Адвольная праграма. Эверэт (ЗША).
**15.00** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Групавы этап. Стамбул (Турцыя).
**17.00** Live. Тэніс. Чэмпіянат WTA. Групавы этап. Стамбул (Турцыя).
**22.45** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Румынія.
**00.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**01.30** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Групавы этап. Стамбул (Турцыя).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 12 серыя.
**08.00** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 4 серыя.
**08.45** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 5 серыя.
**09.15** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.40** «Вышук», маст. фільм, 1998 г., Канада.
**11.10** Госць «Белсату».
**11.30** Без рэтушы: «Фядора, якая лечыць», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**11.50** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**12.05** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**12.30** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 12 серыя.
**13.00** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 4 серыя.
**13.40** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.10** «Прывід з Давыд-Гарадка», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**14.25** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 5 серыя.
**14.55** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**15.20** «Вышук», маст. фільм, 1998 г., Канада.
**16.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** «Сонечная дзіда», серыял: 9 серыя.
**17.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**17.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Госць «Белсату».
**18.25** «Малая Масква», серыял: 2 серыя.
**19.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Эксперт.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Рабінзоны Мантсінсаары», дак. фільм, 2008 г., Беларусь–Германія–Фінляндыя–Францыя.
**22.50** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 5 серыя.
**23.30** Аб'ектыў.
**23.55** Гарачы каментар.

9

## 28 КАСТРЫЧНІКА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.05, 08.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.10** Навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка».
**10.05** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**11.00** Прыгодніцкі дэтэктыў «Апошні кардон» (Украіна-Расія). 2-я серыя.
**12.10** Прыгодніцкая кінааповесць «Кропка адліку» («Беларусьфільм»).
**14.00** Відэафільм АТН « Над Ушачамі восень плыве..» цыклу «Зямля беларуская».
**14.15** Клуб рэдактараў.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультфільм «Ну, пачакай!».
**15.55** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**16.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**17.55** Меладраматычны серыял «Апошні кардон» (Украіна-Расія). 3-я серыя.
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Лігаўка» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** Дэтэктыўны баявік «Кітайскі квартал» (ЗША).
**00.25** Дзень спорту.
**00.35** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** Прэм'ера. Шматсерыйны фільм «Чорныя ваўкі».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Шматсерыйны фільм «Чорныя ваўкі».
**22.20** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі.
**23.35** «Наша Беларaша».
**00.10** Камедыя «Прыватны дэтэктыў, або Аперацыя «Кааперацыя».

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Давай зробім гэта па-хуткаму». Германія- Францыя - Вялікабрытанія, 2001 г.
**10.40** «Ашуканцы».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Хірамант 2». Серыял.
**15.35** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Па той бок ложка». Францыя, 2008 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Расійскія покерные турніры» («Russian Poker Series»).
**00.20** Фільм «Удар галавой». Францыя, 1978 г.
**01.50** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Фільм «Вялікая прыгода» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**11.55** Кожны мае права быць розным.
**12.25** Гаспадар.
**12.55** Кінаспробы.
**13.30** Час футболу.
**14.15** Жаночая ліга.
**15.10** Меладрама «З табой і без цябе» (СССР).
**16.50** Усё аб бяспецы.
**17.25** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.25** Хакей. КХЛ. Атлант (Маскоўская вобл.) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**20.45** «Халі-Галі». Скетч-шоў.
**21.00** «Калыханка».
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.15** Жаночая ліга.
**23.15** Трылер «Доказ смерці» (ЗША).

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Бумеранг з мінулага».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.40** Урачыстае адкрыццё Галоўнай сцэны Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Расіі.
**20.50** Навіны - Беларусь.
**21.00** Весткі.
**21.30** Фільм «Каханне да запатрабавання». 2009 г.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** Фільм «Кактус і Алена».

**НТВ**

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Вочная стаўка».
**11.15** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.20** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**22.30** Прэм'ера. «Бывай, Глушэц!». Незвычайны канцэрт.
**23.45** Фільм «Пятніцкі».

**EUROSPORT**

**09.30** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету. 1/2 фіналу.
**10.30** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету. Фінал.
**11.30** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Групавы этап. Стамбул (Турцыя).
**13.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate America. Пары. Адвольная праграма. Эверэт (ЗША).
**14.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate America. Жанчыны. Адвольная праграма. Эверэт (ЗША).
**15.00** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Групавы этап. Стамбул (Турцыя).
**17.00** Live. Тэніс. Чэмпіянат WTA. Групавы этап. Стамбул (Турцыя).
**22.45** Самыя моцныя людзі планеты. Турнір Giants Live. Фінляндыя.
**23.15** Самыя моцныя людзі планеты. Турнір Giants Live. Фінляндыя.
**23.45** Боўлінг. PBA тур. ЗША. Часопіс.
**00.45** Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня. Часопіс.
**01.15** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**01.30** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Групавы этап. Стамбул (Турцыя).

**БЕЛСАТ tv**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** Басанож па свеце.
**08.00** «Малая Масква», серыял: 2 серыя.
**08.50** «Сонечная дзіда», серыял: 9 серыя.
**09.20** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.45** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**10.10** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**10.20** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Рабінзоны Мантсінсаары», дак. фільм, 2008 г., Беларусь–Германія–Фінляндыя–Францыя.
**11.20** МакраФон: «Рок-карона–2010»: ч. 1.
**11.50** «Радаводны знак», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**12.10** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 5 серыя.
**12.55** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.20** «Сонечная дзіда», серыял: 9 серыя.
**13.50** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**14.15** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**14.40** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Рабінзоны Мантсінсаары», дак. фільм, 2008 г., Беларусь–Германія–Фінляндыя–Францыя.
**15.40** МакраФон: «Рок-карона–2010»: ч. 2.
**16.10** «Малая Масква», серыял: 2 серыя.
**17.00** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 8 серыя.
**17.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**17.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 5 серыя.
**18.50** Без рэтушы: «Фядора, якая лечыць», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**19.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Невядомая Беларусь: «Шанц на «Новае жыццё», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** «Статысты», маст. фільм, 2006 г., Польшча.
**23.45** Вагон.
**23.55** Аб'ектыў.
**00.20** Гарачы каментар.

## 29 КАСТРЫЧНІКА, СУБОТА

**07.00** Існасць.
**07.25** Добрай раніцы, Беларусь!
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10, 10.40, 12.10, 14.15, 14.50, 16.55, 17.30** Тэлемарафон «Пабудуем музей разам».
**09.20** «Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны». Дакументальны фільм.
**09.35** Здароўе.
**10.05** Культурныя людзі.
**10.50** Серыял «Сваты-4» (Украіна).
**12.20** Ваенная драма «Лёс чалавека» (СССР).
**14.25** «Захоўваць вечна». Відэафільм АТН.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**17.05** «Захоўваць вечна». Відэафільм АТН.
**17.40** Відэафільм АТН «Чэрвеньская восень» цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** Ваша лато.
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** Тэлемарафон «Пабудуем музей разам».
**19.25** «Славянскі базар-2011».
**21.00** Панарама.
**21.40** «Сваты-4». Камедыйны серыял.
**22.55** Крымінальны баявік «Перавознік-3» (Францыя).
**00.40** Міжнародны музычны фэст «Крым Мюзік фэст».

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Разумніцы і разумнікі».
**11.55** Мультыплікацыйныя фільмы.
**12.25** Камедыя «Дзве стралы. Дэтэктыў каменнага веку».
**14.20** «Хвіліна славы. Мары спраўджваюцца!».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Аляксандр Міхайлаў. Трэба заставацца мужыком».
**17.20** Прэм'ера. «Адмысловае заданне».
**18.40** «Адзін супраць усіх».
**19.25** «Абмен жонкамі».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Здань оперы». Фінал.
**22.45** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.25** Фільм «Мядовы месяц Камілы».
**01.05** Дэтэктыў «Забойства ў Саншайн-Менар».

**07.15** «Салдаты. Дзембельскі альбом». Серыял.
**09.00** «Жанчыны ХХ стагоддзя».
**09.30** «Чыстая праца».
**10.20** «Мінск і мінчане».
**10.55** Фільм «Па той бок ложка». Францыя, 2008 г.
**12.50** «Прыгоды дылетанта».
**13.25** Фільм «Вакзал для дваіх». СССР, 1982 г.
**16.00** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Кітайская бабуля». Расія, 2009 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Час забіваць». ЗША, 1996 г.
**22.45** «Зорны рынг».
**00.00** «Покер дуэль».
**00.50** Фільм «Зман». ЗША, 2006 г.
**02.15** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**06.40** Фільм «Вялікая прыгода» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**09.15** Усё аб бяспецы.
**09.40** Жансавет.
**10.25** Тэлебарометр.
**10.30** Серыял «Маргоша» (Расія).
**14.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Чэлсі - Арсенал. Прамая трансляцыя.
**16.45** Тэніс настольны. Матч «Еўропа - Азія».
**18.50** Фантастычны баявік «Вікінгі супраць прышэльцаў» (ЗША- Германія).
**21.00** КЕНО.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Баявік «Шайбу! Шайбу!» (ЗША).
**22.55** Трылер «Сакрэты Лос-Анджэлеса» (ЗША).

**РОССИЯ**

**07.00** Фільм «Каханне да запатрабавання». 2009 г.
**08.45** Мультфільмы.
**09.00** Фільм «Рабінавыя ночы».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Кактус і Алена».
**13.30** «Відавочнае-неверагоднае».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.15** Фільм «Справа была ў Пянькове».
**17.05** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40** Прэм'ера. Фільм «Шчасце ёсць». 2011 г.
**00.05** «Дзяўчаты».

**НТВ**

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Медыцынскія таямніцы».
**08.50** «Акадэмія прыгажосці».
**09.25** «Гатуем».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль-4».
**15.10** «Жаночы погляд».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Таямнічая Расія».
**17.25** «Вочная стаўка».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.05** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.05** «Ты не паверыш!».
**23.00** «Апошняе слова».
**00.00** Драма «Імаджынарыум доктара Парнаса».

**EUROSPORT**

**09.30** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Групавы этап. Стамбул (Турцыя).
**11.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Жанчыны. Кароткая праграма.
**12.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Пары. Кароткая праграма.
**13.30** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Групавы этап. Стамбул (Турцыя).
**15.00** Live. Тэніс. Чэмпіянат WTA. Стамбул (Турцыя). 1/2 фіналу.
**19.00** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету. 1/2 фіналу.
**20.00** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету. Фінал.
**21.00** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Жанчыны. Адвольная праграма.
**23.00** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Пары. Адвольная праграма.
**00.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Мужчыны. Кароткая праграма.
**02.00** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Мужчыны. Адвольная праграма.

**БЕЛСАТ tv**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 5 серыя.
**08.20** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 8 серыя.
**08.45** Калыханка для самых маленькіх.
**09.10** Прыватная калекцыя.
**09.30** Еўропа сёння.
**10.00** Без рэтушы: «Фядора, якая лечыць», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**10.15** Форум (ток-шоу): «Ці не рана нам у Еўропу?».
**10.55** ПраСвет.
**11.20** Невядомая Беларусь: «Шанц на «Новае жыццё», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**11.50** Вагон.
**11.55** Еўропа сёння.
**12.25** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 7 серыя.
**12.50** Калыханка для самых маленькіх.
**13.15** Невядомая Беларусь: «Шанц на «Новае жыццё», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**13.45** Прыватная калекцыя.
**14.05** «Статысты», маст. фільм, 2006 г., Польшча.
**16.00** Вагон.
**16.05** «Царква на мяжы», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**16.30** ПраСвет.
**17.00** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 2 серыя.
**17.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Чаму дэмакратыя? 6 серыя: «За Бога, цара і Айчыну».
**19.00** Зона «Свабоды».
**19.30** Вагон.
**19.35** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** На колах.
**20.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.35** Беларускія лёсы: «Аляксандр Ісачоў. Майстар і Афрадыта», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.40** Суботні сеанс: «Вінаватыя сэрцы», драма, 1999 г., ЗША: ч. 2.
**23.05** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 9 серыя.
**23.50** Аб'ектыў.

## 30 КАСТРЫЧНІКА, НАДЗЕЛЯ

**07.35** Міжнародны музычны фэст «Крым Мюзік Фэст».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Арсенал.
**09.40** Зброя.
**09.55** Фартыфікацыя.
**10.40** Відэафільм АТН «Чэрвеньская восень» цыклу «Зямля беларуская».
**10.50** Серыял «Сваты-4» (Украіна).
**12.10** Прыгодніцкі фільм «Балада аб доблесным рыцары Айвенга» (СССР).
**14.00** Прэм'ера. «Пра каханне…». Дакументальны фільм («Беларусьфільм»).
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Відэафільм АТН «На родзе напісана…».
**16.00** Прыгодніцкая камедыя «Марлі і я» (ЗША).
**18.10** Суперлато.
**19.15** Авантурная меладрама «Добрая жанчына» (Вялікабрытанія-Італія-ЗША).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Серыял «Сваты-4» (Украіна).
**23.05** Меладрама «Вяртанне» (Іспанія).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** «Фазэнда».
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**12.40** Камедыя «Я крочу па Маскве».
**14.10** Фільм «Хлопчыкі-дзяўчынкі».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе насялення.
**17.30** АНТ прадстаўляе: «Эстрадны кактэйль».
**18.40** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**00.00** Камедыя «Не трэба засмучацца».

**06.50** «Салдаты. Дзембельскі альбом». Серыял.
**08.35** «Аўтапанарама».
**09.05** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.05** «Вялікі сняданак».
**10.45** Фільм «Час забіваць». ЗША, 1996 г.
**13.25** «Добры дзень, доктар».
**13.55** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «Тарпеда» Жодзіна - «Шахцёр» Салігорск. Прамая трансляцыя.
**16.00** «Я - вандроўца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Апошняя справа Ламаркі». ЗША, 2002 г.
**22.40** Фільм «Басейн». Францыя - Вялікабрытанія, 2003 г.
**00.15** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**07.05** Фантастычны баявік «Вікінгі супраць прышэльцаў» (ЗША-Германія).
**09.15** «Правы чалавека».
**09.30** Дабравест.
**09.55** Мір вашай хаце.
**10.10** Тэлебарометр.
**10.15** Кінаспробы.
**10.45** Страсці па культуры.
**11.30** Серыял «Маргоша» (Расія).
**13.40** Тэніс настольны. Матч «Еўропа - Азія».
**15.55** Хакей. КХЛ. Тарпеда (Ніжні Ноўгарад) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**18.30** Жаночая ліга.
**19.25** Смешная часіна.
**19.55** Фінальны канцэрт «Маладыя таленты Беларусі».
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Навіны надвор'я.
**21.40** Авантурная камедыя «Сястрычка Бэці» (ЗША).
**23.50** Канцэрт «Ozzy Osbourne. Live At Budokan».

### РОССИЯ

**07.00** «Уся Расія».
**07.15** «ХА». Маленькія камеды.
**07.40** Фільм «Шчасце ёсць». 2011 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Фільм «Ішоў чацвёрты год вайны…».
**13.30** «Смехапанарама».
**14.00** Весткі.
**14.15** «З новай хатай!».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст.
**15.35** Прэм'ера. «Золата інкаў».
**16.25** Фільм «Мяне гэта не тычыцца».
**18.10** Юбілейны вечар-канцэрт.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. Фільм «На ўсё жыццё». 2011 г.
**22.55** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.00** «Я не шкадую ні пра што». Канцэрт.

### НТВ

**07.35** «У зоне адмысловай рызыкі».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Першая перадача».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль-4».
**15.05** Прэм'ера. «ГРУ. Таямніцы ваеннай выведкі».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Следства вялі…».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.45** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**21.55** Прэм'ера. «Мікалай Баскаў. Мая споведзь».
**22.55** «Нтвшнікі».
**23.55** Дэтэктыў «За межамі закона».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Стамбул (Турцыя). 1/2 фіналу.
**11.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Мужчыны. Адвольная праграма.
**12.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Жанчыны. Адвольная праграма.
**14.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Пары. Адвольная праграма.
**15.30** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Стамбул (Турцыя). 1/2 фіналу.
**17.00** Live. Тэніс. Чэмпіянат WTA. Стамбул (Турцыя). Фінал.
**19.00** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Адвольны танец.
**19.45** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Пары. Адвольная праграма.
**21.00** Live. Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate Canada. Паказальны выступ.
**23.00** Мотаспартыўны часопіс.
**23.15** Бокс. Чэмпіянат свету па версіі WBA. Германія.
**00.45** Тэніс. Чэмпіянат WTA. Стамбул (Турцыя). Фінал.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
**07.45** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**08.05** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 2 серыя.
**08.50** «Сонечная дзіда», серыял: 9 серыя.
**09.20** Калыханка для самых маленькіх.
**09.45** Чаму дэмакратыя? 6 серыя: «За Бога, цара і Айчыну».
**10.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**11.05** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**11.30** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 9 серыя.
**12.20** Два на два (тэледыскусія).
**12.45** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.10** Калыханка для самых маленькіх.
**13.40** Беларускія лёсы: «Аляксандр Ісачоў. Майстар і Афрадыта», дак. фільм, 2008 г., Беларусь 7 серыя.
**14.05** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 2 серыя.
**14.50** «Дарога на Вільню», дак. фільм 2008 г., Беларусь.
**15.05** «Вінаватыя сэрцы», драма, 1999 г., ЗША: ч. 2.
**16.30** «Беларускі лес», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Малая Масква», серыял: 3 серыя.
**18.10** Два на два (тэледыскусія).
**18.35** «1945. год, які змяніў свет», дак. фільм, 2005 г., Вялікабрытанія: 4 серыя.
**19.25** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.40** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Дакументальная гадзіна: «Банахавы прасторы», дак. фільм, 2005 г., Польшча.
**20.40** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.40** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.10** Фільматэка майстроў: «Пупэнда», маст. фільм, 2003 г., Чэхія.
**00.00** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.10** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**00.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).

## Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029)) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8029) 178 31 68 Вольгв
Бабруйск (8029) 628 75 01 Вольга
Слуцк (8044) 755 66 48 Марына

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ___________
Кассир Всего ___________

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

МАНАРХІЯ

# БАГРАЦІЁН СУПРАЦЬ СААКАШВІЛІ

Алег НОВІКАЎ

**27 верасня ў прадстаўнікоў грузінскай царскай сям’і Баграціёнаў нарадзіўся сын. Манархісцкая грамадскасць Грузіі звязвае з гэтым хлопчыкам надзею хуткай рэстаўрацыі ў краіне манархіі і звяржэння прэзідэнта Саакашвілі.**



Давід Баграціён-Мухранскі і Ганна Баграціён-Грузінская

Хлопчыка, які з’явіўся на свет у Іспаніі, назвалі Георгіем. Ён з’яўляецца прадстаўніком дынастыі, якая афіцыйна вядзе сваё паходжанне ад біблейскага цара-прарока Давіда. Паводле радаводу Баграціёнаў, князя Георгія аддзяляюць ад цара Давыда 105 пакаленняў.

Па легендзе, нашчадак біблейскага героя Давіда Гуарам (Гурам) прыбыў у Грузію ў пачатку VI стагоддзя. Унук Гурама атрымаў ад візантыйскага імператара Юстыніяна сан цара. Адпаведна яму, ён першым стаў называцца Баграціён. З гэтага часу Баграціёны кіравалі Грузіяй аж да 1801 года. Пакуль Аляксандр I сваім маніфестам ад 12 верасня 1801 года канчаткова не далучыў грузінскія землі да Расіі. Тытул цара Грузіі перайшоў да дому Раманавых. Пазней прадстаўнікоў роду Баграціёнаў спецыяльным указам імператара сталі называць «сябры былога царскага дому Грузіі».

З пункту гледжання манархічнага права, рэформа вельмі дзіўная. Раманавы на той час былі памазанікамі божымі не больш за 200 гадоў. А Баграціёны — адна з найстаражытнейшых у гісторыі чалавецтва дынастый (пасля імператарскіх дынастый Японіі і Эфіопіі).

Адначасова сябры грузінскай царскай сям’і гвалтоўна былі вывезены ў Расію. Ім доўгі час забаранялася наведваць радзіму. Нейкі час царская сям’я ў выгнанні была асяродкам крамолы. З разлікам на вяртанне Баграціёнаў у Грузіі рыхтаваўся шэраг паўстанняў. Аднак з часам самі Баграціёны, якія ў 1865 годзе атрымалі тытул князёў Грузінскіх, здаецца, страцілі інтарэс да ідэі незалежнасці роднага краю. Баграціёны сталі адной з самых вядомых расійскіх арыстакратычных фамілій. Дастаткова ўзгадаць Пятра Баграціёна — героя вайны 1812 гады. Таксама Баграціёны былі губернатарамі, мецэнатамі, правазнаўцамі.

Не дзіўна, што падчас Першай сусветнай вайны грузінскія эмігранты, якія пад кіраўніцтвам князя Мачабелі стварылі Нацыянальны камітэт у Берліне і выступалі за аднаўленне манархіі ў Грузіі, прапанавалі паставіць на грузінскі пасад нейкага нямецкага прынца.

У часы рэвалюцыі і грамадзянскай вайны спроб аднаўлення манархіі з боку Баграціёнаў не было. У Грузіі дамінавалі сацыял-дэмакраты, якія стварылі Грузінскую Дэмакратычную Рэспубліку. Магчыма, таму савецкая ўлада пасля прыходу на бераг Куры спачатку спакойна паставілася да ўладальнікаў блакітнай крыві. Аднак з-за напружанай палітычнай атмасферы царская сям’я сама вырашыла эміграваць. Дарэчы, ім дапамог пераехаць на Захад Максім Горкі.

На гэты час у субардынацыі паміж арыстакратамі адбыліся значныя змены. Яшчэ напрыканцы XIX стагоддзя памёр апошні прадстаўнік старэйшай лініі царскага дому. З гэтага часу старэйшай лініяй у доме Баграціёнаў з’яўляюцца нашчадкі брата цара Вахтанга V — царэвіча Канстанціна, якія валодалі Мухранскім уездам. Таму гэта дынастыя завецца Багратыён-Мухранская. Гонар валадароў Мухрані нават увайшоў у народную прымаўку. «Што ты сядзіш, як Мухранскі?» — кажуць у Грузіі ганарыстым людзям.

Пасля эміграцыі на Захад Багратыёны разбегліся хто куды, пакуль у 1942 годзе пад патранатам Мусаліні не сабраліся ў Італіі і не дамовіліся пра тое, што законным прэтэндэнтам на сталец адзінай Грузіі з’яўляецца князь Іраклій. Адначасова манархісты дабіліся, каб Уладзімір Кірылавіч Раманаў — афіцыйны прэтэндэнт на расійскі трон, прызнаў Іраклія роўным.

> **Манархічны праект ва ўмовах вакууму апазіцыі і выкліканай сыходам Саакашвілі магчымай палітычнай дэстабілізацыі можа быць запатрабаваны грамадствам. Плюс спадабацца маскоўскім спонсарам**

Грузінскі манархісцкі рух так ці інакш адрадзіўся, хаця і застаўся невялікай фракцыяй унутры дыяспары. Большасць эмігрантаў прызнавала нацыянальным цэнтрам органы Грузінскай Дэмакратычнай Рэспублікі, якія пераехалі на Захад.

Пасля абвяшчэння незалежнасці Грузіі манархісты атрымалі магчымасць працаваць легальна на радзіме. Сюды пераехаў Давід, нашчадак царскага роду. Узнікла манархісцкая партыя. Спачатку дзейнасць манархістаў не выклікала вялікага інтарэсу грамадства. Аднак у атмасферы палітычнага хаосу 1990-х гадоў ідэя наяўнасці ў краіне стабільнага падмурку ўлады ў выглядзе манарха пачала паступова заваёўваць масы.

Гэтаму спрыяла таксама тое, што галоўным лабістам праекту пераходу да канстытуцыйнай манархіі стаў Патрыярх Грузіі Ілля Другі.. «З дня спынення ўлады Баграціёнаў у 1801 годзе грузінскі народ песціць мару пра аднаўленне гэтай найстаражытнейшай, блаславёнай дынастыі. Сёння ў Грузіі ствараюцца ўмовы для таго, што мара грузінскага народа пра аднаўленне канстытуцыйнай манархіі можа быць ажыццёўлена, калі на тое будзе воля Божая», — кажа Ілья.

Справа не абмежавалася словамі. У лютым 2009 года быў заключаны шлюб паміж прадстаўнікамі дзвюх вядучых галін царскай сям’і. У тбіліскім кафедральным саборы заключылі шлюб Давід Баграціён-Мухранскага і Ганна Баграціён-Грузінская. Гэта падзея мела відавочны палітычны і апазіцыйны падтэкст, паколькі рэжым Саакашвілі пасля грузінска-расійскай вайны адчуваў сябе нестабільна.

«Нацыянальная ганьба — следства нападу рэжыму Саакашвілі на Паўднёвую Асецію — не пакідае цяперашняму грузінскаму прэзідэнту шанцаў захоўваць у руках уладу яшчэ хоць бы паўгода. Апазіцыя абмяркоўвае варыянты будучага дзяржаўнага ладу краіны. З прычыны адсутнасці адзінага і моцнага лідара, як найболей прымальны на дадзены момант, разглядаецца варыянт вяртання да мадэлі манархіі. Ужо да канца года Саакашвілі, хутчэй за ўсё, будзе выгнаны з Грузіі, а на трон вернуцца нашчадкі дынастыі Баграціёнаў», — пісалі тады блізкія да манархістаў выданні.

На той час, паводле сацыялагічных даследаванняў, 45% грамадзян Грузіі падтрымалі праект змены палітычнага ладу Грузіі і пераход да манархічнай формы ўлады, 29,6% выказаліся супраць гэтага, і яшчэ 25,4% не ведалі адказу на пытанне.

Аднак Саакашвілі змог утрымаць уладу і стабілізаваць сітуацыю. У сваю чаргу, царскі шлюб аказаўся не такім ужо і ідэальным. Давід і Ганна так моцна пасварыліся, што нават раз’ехаліся і больш за год жылі асобна. Аднак цяпер, здаецца, у іх адносінах зноў пачаліся «мір і каханне». Лепшым прыкладам таму ёсць нараджэнне Георгія.

Навіны з Іспаніі сталі энергетычным напоем для грузінскіх манархістаў. Зноў чуюцца лозунгі за пачатак сур’ёзнай дыскусіі наконт магчымай змены дзяржаўнага ладу. Уладам прапануецца афіцыйна абвясціць Георгія будучым царом і пачаць рыхтаваць малога да ўваходжання на трон.

Спрыяльным фонам для такога кшталту дэбатаў ёсць нявызначаная палітычная сітуацыя. Апазіцыя яшчэ не аднавіла былую форму пасля майскіх падзей 2011-га, калі ў турмы за спробу перавароту кінулі частку яе лідараў. Адначасова падыходзіць да канца прэзідэнцкі мандат Саакашвілі. Больш па Канстытуцыі быць прэзідэнтам яму забаронена.

Манархічны праект ва ўмовах вакууму апазіцыі і выкліканай сыходам Саакашвілі магчымай палітычнай дэстабілізацыі можа быць запатрабаваны грамадствам. Плюс спадабацца маскоўскім спонсарам.

Не дарма апошнім часам у афіцыёзе пачалася незвычайная кампанія супраць Баграціёнаў. Ім згадваюць усе: і перш за ўсё стаўку на Расію напрыканцы XIX стагоддзя. Гэта можа спрацаваць, паколькі тая падзея — вялікая рана для грузінаў. Маніфест 1801 года сапраўды можна лічыць фенаменальным гістарычным фіяска грузінскіх палітыкаў, якія марылі захаваць суверэнітэт і аднавіць унутраны мір пад пратэктаратам Расіі. Нават краіны з менш развітай дзяржаўнай традыцыяй (Фінляндыя, Украіна) былі ўключаны ў склад Расійскай Імперыі, захаваўшы большую ступень аўтаноміі.

Між тым, маленькі Георгій наўрад яшчэ можа сказаць слова «мама». Нават жудасна ўявіць, што будзе ў Грузіі, калі немаўля падрасце.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Нядаўна ў ролі выратавальніка беларускай эканомікі выступіў Махмуд Ахмадзінежад, прэзідэнт Ірана. Ён даў Мінску крэдыт у памеры звыш 400 мільёнаў долараў. Гэта дапаможа Лукашэнку прынамсі пару месяцаў утрымліваць планавую эканоміку краіны. Той факт, што сваю дапамогу беларускаму рэжыму прапануюць аўтарытарныя рэжымы, з’яўляецца доказам правалу палітыкі Захаду. ЕС ужо не ведае, што яму рабіць, акрамя як караць мінскіх палітыкаў забаронамі на ўезд.

**«Handelsblatt» (Германія)**

Меры, ухваленыя на зачыненай сесіі «парламента» і апублікаваныя на ўрадавым сайце, уводзяцца ў той момант, калі ў аўтарытарнай дзяржаве з насельніцтвам у 10 мільёнаў чалавек узмацнілася абуранасць і іншадумства ў сувязі з эканамічным крызісам, з-за якога беларускі рубель страціў яшчэ трэціну свайго кошту. Улады жудасна баяцца магчымых беспарадкаў. Яны робяць стаўку на рэпрэсіі, таму што ў іх не застаецца іншых інструментаў.

**«The Washington Post» (ЗША)**

Падобна на тое, што Лукашэнка трохі палохалі ліберальныя замашкі Мядзведзева. З больш цвёрдым Пуціным яму будзе камфортней працаваць, пра што ўласна ў артыкуле ў *«Известиях»* ён недвухсэнсоўна дае зразумець. Ну што ж, Бацька, «велком ту Раша».

**Газета.Ру (Расія)**

Лукашэнка спрабуе атрымаць фінансавую дапамогу ад галоўнага паплечніка і фундатара Беларусі, Расіі. Але Масква стала выкарыстоўваць сітуацыю для таго, каб узмацніць ціск на Беларусь з мэтай прымусіць яе прадаць дзяржаўныя кампаніі, ад чаго Лукашэнка заўсёды адмаўляўся.

**«The Associated Press» (ЗША)**

Беларускі рубель стаў лягчэй фанеры. Меры каманды прэзідэнта Лукашэнкі па стабілізацыі нацыянальных фінансаў пакуль не даюць выніку. Мясцовыя эканамісты ўпэўненыя, што неўзабаве курс перакрочыць адзнаку ў 10 тысяч. Менавіта ў гэтай мяжы Нацбанк суседняй краіны спадзяецца стабілізаваць адзіны валютны курс. Эксперты лічаць, што пакуль усе здзейсненыя меры правальваюцца, паколькі Нацыянальны банк не выключае друкарскі варштат: пасля рэзкага росту коштаў улады пайшлі і на падвышэнне заробкаў.

**«Вечерняя Москва» (Расія)**

У паведамленні прэс-службы ўрада адзначаецца, што Беларусь па-ранейшаму разлічвае на крэдыт МВФ у памеры 3,5–7 мільярдаў долараў. Як сведчаць «рынкавыя» крокі ўрада, шанцы на яго атрыманне ёсць. Тым часам узровень жыцця насельніцтва імкліваваліцца. Як паведаміў Белстат, сярэдняя зарплата па выніках верасня склала 220 долараў у эквіваленце супраць 500 долараў у канцы мінулага года. Цяперашнія інфляцыйныя стрэсы — следства папулісцкай палітыкі ўладаў напярэдадні выбараў, сцвярджаюць эксперты і дзівяцца, як насельніцтва доўга трывае ўсё гэта.

**«Независимая газета» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ



### КАЗАХСТАН. ВА ЎСІМ ВІНАВАТЫЯ РЭПАТРЫЯНТЫ

Цімур Кулібаеў, старшыня дзяржаўнага фонду Казахстана, назваў галоўнымі арганізатарамі забастоўкі нафтавікоў на Мангышлаку аралманаў. Аралманы — гэта этнічныя казахі, якія жывуць у замежжы (галоўным чынам у Манголіі і Кітаі) і зараз у рамках спецыяльнай дзяржаўнай праграмы вяртаюцца на радзіму. Стаўленне да іх з боку тутэйшых вельмі супярэчлівае, паколькі рэпатрыянты — людзі іншай культуры. Паступова пачаліся канфлікты і з адміністрацыяй. Усё таму, што, як правіла, аралманы больш арганізаваныя, паколькі жывуць па прынцыпу грамады, і, адпаведна, могуць калектыўна абараняць свае правы. Той факт, што яны — былыя качэўнікі, дазваляе ім быць непатрабавальнымі ў побыце і лёгка пераносіць цяжкасці. Відавочна, што заява Кулібаева выводзіць «аралманафобію» на новы ўзровень. Нават прагучала ідэя стварэння для рэпатрыянтаў на Мангышлаку асобных аулаў, падобных на рэзервацыю, каб аралманы не падрывалі грамадскую стабільнасць. У сваю чаргу, грамадскія арганізацыі ўжо заклікалі прыпыніць ксенафобскую кампанію супраць суайчыннікаў.

**Паводле казахскай прэсы**

### УКРАІНА. ДАЙЦЕ ПРЫТУЛАК У ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЕ

Ігар Ільчанка, жыхар горада Нікалаеў, накіраваў ліст да кіраўніка аблвыканкаму Львоўскай вобласці, у якім папрасіў палітычны прытулак. На такі крок яго падштурхнула дзейнасць адміністрацыі роднага горада, якая ігнаруе яго патрабаванні забяспечыць адпаведны статус украінскай мове ва ўладных інстытутах. Нягледзячы на тое, што больш за 70 працэнтаў жыхароў Нікалаева этнічныя ўкраінцы, тут паўсюль, у тым ліку ў калідорах улады, пануе руская мова. Украінскамоўны Ільчанка паспрабаваў дабіцца шляхам іскаў супраць канкрэтных чыноўнікаў выканання закону аб дзяржаўным статусе ўкраінскай мовы, аднак ні разу справа не дайшла да судовага разгляду. Акрамя таго, Ільчанка ўвесь час сутыкаецца з дыскрымінацыяй на вуліцы. Яго ў вочы называюць бандэраўцам. Гэтага, на думку Ільчанкі, дастаткова, каб яму надалі статус палітычнага ўцекача ў Львове, які лічыцца сталіцай украінскага нацыяналізму.

**Паводле ўкраінскай прэсы**



### БАЛІВІЯ. СВЯТА ДЭКАЛАНІЗАЦЫІ

Эва Маралес, прэзідэнт Балівіі, падпісаў спецыяльны ўказ аб папраўках у каляндар дзяржаўных святочных дзён. Цяпер у спіс чырвоных дат дабаўлена 12 снежня. Яго будуць святкаваць як Дзень дэкаланізацыі. Выбар на карысць 12 снежня падаецца, мякка кажучы, дзіўным. Менавіта ў гэты дзень Калумб дасягнуў Амерыкі. Аднак у Эва Маралеса свая логіка. Ён лічыць, што дзень адкрыцця Амерыкі стаў першым днём пачатку барацьбы індзейцаў супраць каланізатараў. І гэта барацьба, як сцвярджае балівійскі гарант, працягваецца дасюль. Ход думкі першага ў гісторыі краіны прэзідэнта-індзейца дастаткова цікавы, калі ўзгадаць, што зараз сталіца краіны Ла-Пас ахопленая масавымі пратэстамі індзейцаў супраць падтрыманага Маралесам праекту пабудовы трубаправоду праз іх землі. Вось і думай, хто пасля гэтага Маралес — каланізатар або дэкаланізатар?

**Паводле іспанскай прэсы**

### ГЕРМАНІЯ. ВЯРТАННЕ ЛЕВАГА ТЭРАРЫЗМУ




Нямецкі правы палітыкум усур'ёз кажа пра магчымае вяртанне ў краіну левага тэрарызму. Нагадаем, што на працягу 1970–1980-х гадоў у ФРГ актыўна дзейнічала ўзброеная падполле — арганізацыя Фракцыі Чырвонай Арміі (RAF), якая нейкі час трымала ў жаху ўвесь палітычны істэблішмент. Пасля краху берлінскай сцяны інтарэс левакоў да гэтай формы барацьбы знік, і праз нейкі час RAF абвясціла пра сваю самаліквідацыю. Падставай казаць пра тое, што RAF вяртаецца, стала міна, якую знайшлі на берлінскай чыгунцы. Раней у горадзе адбыўся шэраг падпалаў, адказнасць за якія ўзялі на сябе левыя экстрэмісцкія групоўкі. Хрысціянскія дэмакраты Берліна ўжо патрабавалі ад уладаў прыняцця спецыяльнага пакету супраць левага экстрэмізму. Бургамістр гораду сацыял-дэмакрат Клаус Воверайт кажа, што левы тэрарызм немцам не пагражае. Ён лічыць, што тыя падпалы — гэта тыповыя акцыі панкаў-тынэйджараў.

**Паводле нямецкай прэсы**

ЦІКАВА

# АКУПАЦЫЯ ПЛАНЕТЫ




**Алег НОВІКАЎ**

**Глабальны маштаб акцый Occupy, якая пракацілася па свету 15 кастрычніка, прымушае казаць пра новую хвалю моладзевых антыкапіталістычных пратэстаў. Палітолагі і самі ўдзельнікі пратэстаў спрачаюцца наконт перспектываў новага руху. Прапануем агляд сусветнай прэсы.**

Нагадаем, што з 17 верасня група антыглабалістаў і анархістаў пачала праводзіць у Нью-Ёрку акцыю *Occupy Wal Street*, пратэстуючы супраць дыктату фінансавых карпарацый. Пасля таго, як паліцыя паспрабавала ачысціць гарадок пратэстуючых, пра іх пачакала казаць прэса, і не толькі амерыканская. Людзі з усяго свету (і не толькі палітычна заангажаваныя) зацікавіліся *OWS* (англ.: *Occupy Wal Street*). Так узнікла ідэя сусветнай акцыі.

Усяго ў акцыях незадаволеных узялі ўдзел людзі ў 82 краінах. Маніфестацыі прайшлі ў 950 гарадах. Самыя вялікія акцыі мелі месца ў ЗША. У выніку маршу ў Нью-Ёрку былі арыштаваныя 22 чалавека, якія захапілі офіс *Citibank*. Значна больш арыштаваных было ў Чыкага. Там у выніку паліцэйскага хапуна ў турму трапіла 175 чалавек. У Еўропе самай значнай пляцоўкай для выступаў сталі Рым і Лісабон. У італьянскай сталіцы справа ўвогуле дайшла да пагромаў дзяржаўных устаноў. Інцыдэнты мелі месца таксама ў Лондане. У ФРГ, дзе да акцыі далучыліся прафсаюзы, на вуліцы выйшла больш за 50 тысяч чалавек. Геаграфія пратэстаў таксама ўключае Прагу, Брусэль, Карачы, Тайвань, Сідней і г.д. Нават эстонцы, нацыянальнаму менталітэту якіх прыпісваюць пасіўнасць, пайшлі на акцыю. У цэнтры Таліна купка моладзі пратэставала супраць банкіраў, якія дзяруць з кліентаў па тры скуры.

Самае цікавае, што самі аб'екты крытыкі часта пагаджаліся з пратэстуючымі, якія патрабавалі падпарадкаваць фінансавую сістэму народным інтарэсам. Напрыклад, Джым Флаэрці, міністр фінансаў Канады, заявіў, што «сучасная падатковая сістэма ў краіне не лепшым спосабам вырашае праблему дыспрапорцыі ў даходах паміж багатымі і беднымі». Ангела Меркель кажа, што «асабіста разумее людзей, якія захопліваюць плошчы». Вольфган Шойбле, хадзячы сімвал нямецкага кансерватызму, падтрымаў ідэю барацьбы з біржавымі спекулянтамі (з гэтага патрабавання пачынаўся калісьці рух антыглабалістаў).

Як ні парадаксальна, найбольш крытыкаў на адрас *OSW* можна сустрэць на старонках левай прэсы. Так, Зігмунт Бауман — адзін з вядучых левых інтэлектуалаў, на старонках іспанскай *«El Pais»* кваліфікуе гэты рух як «эмацыйны»: «Эмоцыя можа разбурыць, аднак не здольная нешта пабудаваць. Людзі збіраюцца на плошчах, каб крычаць нейкія лозунгі. Усіх іх аб'ядноўвае тое, супраць чаго яны выступаюць. Можна даць сто варыянтаў адказаў на адно балючае пытанне, і гэта хутка разбурыць адзінства натоўпу. Эмоцыі (на жаль) — ліквідная рэч. Выкід калектыўных эмоцый стварае карнавал. У час карнавалу дазволена ўсё, аднак да таго часу, пакуль сам карнавал не закончыўся». На думку Баўмана, прынцып *OSW* — мець выключна ананімных лідараў і схільнасць да гарызантальнай мадэлі арганізацыі — мае негатыўны акцэнт. Як мяркуе сацыёлаг, гэта прадукт суперіндывідуалізму, які навязвае людзям сучасная масавая культура. Праўда, Бауман пагаджаецца, што 15 кастрычніка стала «лабараторыяй новых сацыяльных дзеянняў».

Песімізм у ацэнках будучага руху Occupy лёгка тлумачыцца. Патэтычныя экзерсісы «акупантаў» пра набліжэнне новага свету вельмі нагадваюць лексікон першай генерацыі антыглабалістаў, якія яшчэ 10 гадоў таму былі ў вялікай модзе. Аднак з часам кураж прайшоў, і рух пайшоў на спад.

Нядзіўна, што адзін нямецкі палітычны каментатар у сваім артыкуле пра будучыню руху 15 кастрычніка цытуе персанажа п'есы Брэхта: «Твая мужнасць добрая толькі тады, калі яна будзе доўгай. Калі яна кароткая, ідзе лепш ідзі дахаты».

На думку каментатара, чый артыкул друкуе *«Tageszeitung»*, вулічныя маніфестацыі здольныя толькі нешта тэматызаваць, аднак не змяняць стан рэчаў. Ён лічыць, што арганізатары пратэстаў стаяць перад вялікай дылемай: «Толькі партыі могуць падтрымліваць у доўгатэрміновым фармаце матывы пратэсту, аднак, з іншага боку, існуючыя палітычныя механізмы дазваляюць знішчаць радыкальную энергію і парыў актывістаў. Так ці інакш, існуе пытанне стабільнага палітычнага прагрэсу. Нашы лозунгі аб эпахальных зменах супярэчаць нашай гатоўнасці змагацца за палітычную большасць. — І перш за ўсё выдаткоўваць на гэта асабісты вольны час», — піша эксперт. Матэрыял заканчваецца на аптымістычнай ноце. Аўтар прапануе актывістам не цурацца працаваць з існуючымі левымі і прагрэсіўнымі партыямі.

Ідэя дыялогу таксама абмяркоўваецца па той бок Атлантыкі. Уплывовы сярод левай часткі дэмакратаў часопіс *«The Nation»* выступае за стварэнне на базе пратэстнага руху нейкай арганізацыі, падобнай да заснаванага Сарай Пэйлін кансерватыўнага грамадскага руху *«Tea Party»*. Рух *«Tea Party»*, не будучы секцыяй рэспубліканскай партыі, фактычна выконвае функцыю яе правага крыла, уплывае на ўнутраную дыскусію, стварае імідж лідарам. Чаму б не стварыць нешта падобнае пры партыі дэмакратаў, — задаецца пытаннем выданне. Тым больш, што сам Абама ў той жа дзень, 15 кастрычніка, заявіў, нібы фрагментарна падтрымлівае лозунгі *OWS*, гатовы іх рэалізаваць, але з адной папраўкай: «не дэманізуючы людзей, якія працуюць на Уол-Стрыт».

Аднак, здаецца, самі «акупанты» не гатовыя прыняць ідэю ператварэння ў нейкую структуру пры прагрэсіўнай партыі. Пра гэта сведчыць вопыт Іспаніі, дзе зараз ідзе выбарчая парламенцкая кампанія. Рух М15 — фактычна папярэднік *Occupy*, удзельнікі якога ўвесну акупавалі цэнтральныя плошчы сталіцы — мала заўважны ў гэтай кампаніі.

На форумах амерыканскіх актывістаў *Occupy* таксама мала жадаючых бегчы запісвацца ў партыю Абамы, на што ёсць сур'ёзныя прычыны. Уол-Стрыт акупавалі людзі, якія тры гады таму галасавалі за Абаму. Сёння яны расчараваныя, але гэта расчараванне прывяло не да апатыі і дэмабілізацыі, а наадварот штурхае да пратэсту. Абама не можа дазволіць сабе канфрантацыі з пратэстуючымі. Яго сацыяльная база і так вельмі вузкая. Аднак і выканаць іх патрабаванні ён не зможа. Гэта азначала б карэнны перагляд усёй эканамічнай палітыкі адміністрацыі, разрыў з фінансавым капіталам.

Пакуль, як бачым, рух *Occupy* ідзем шляхам антыглабалістаў, рызыкуючы ператварыцца ў лявацкую субкультуру. Аднак нельга казаць, што ўсе закончыцца моладзевай тусоўкай. Зеніт руху антыглабалістаў прыпаў на дакрызісныя часы, калі грамадства не ўспрымала ўсур'ёз радыкальныя сацыяльныя лозунгі. Не кажучы пра тое, што ў антыглабалістаў не было такой моцнай зброі, як сацыяльныя сеткі. Увогуле, нівodная палітычная сіла ў гісторыі не мела такога сродку мабілізацыі. Таму нешта канкрэтнае лепш не прагназаваць, а дачакацца 29 кастрычніка, калі будзе больш ясна. Зараз на форумах акупантаў разгарнулася дыскусія: ці не арганізаваць у гэты дзень чарговую сусветную вылазку.

ПСІХАЛОГІЯ

# КАРНЭГІ І СМАЙЛІКІ

Алег НОВІКАЎ

**75 гадоў таму была выдадзеная кніжка Дэйла Карнэгі «Як здабываць сяброў і ўплываць на людзей» — самы славуты ў гісторыі дапаможнік па этыкету, які сёння патрабуе актуалізацыі.**




Кніга з’явілася на паліцах амерыканскіх кніжных крамаў у лістападзе 1936 года і адразу стала бестселерам. Толькі на працягу жыцця аўтара (Дэйл Карнэгі памёр у 1955 годзе) было прададзена каля 5 мільёнаў асобнікаў. Усяго за 75 гадоў толькі ў ЗША надрукавалі 30 мільёнаў экземпляраў. На працягу дзесяці гадоў кніга лічылася ў спісах бестселераў газеты «The New York Times», што дагэтуль з’яўляецца абсалютным рэкордам.

Кніга, як вядома, уяўляе сабой збор практычных парад і жыццёвых гісторый. Калі імі кіравацца, то, як кажа аўтар, можна зрабіць фантастычную кар’еру і атрымліваць задавальненне ад жыцця. У доказ Карнэгі спасылаецца на бытавыя гісторыі, біяграфіі з жыцця славутых людзей або проста знаёміць з іх выказваннямі. Непасрэдна яго парады можна раскласці на 4 блокі: сродкі выклікаць у людзей інтарэс да сябе; сродкі схіляць людзей да свайго пункту погляду; сродкі змяніць чалавека, каб ён сам не пакрыўдзіўся пры гэтым; сродкі зрабіць ваша жыццё шчаслівым.

Галоўны дэвіз Карнэгі: пазбягайце канфліктаў, намагайцеся спадабацца чалавеку, і тады можаце ім маніпуляваць. Іншымі словамі, у свеце няма дрэнных людзей, а ёсць толькі непрыемныя акалічнасці, з якімі можна змагацца, і зусім не варта з-за іх псаваць жыццё і настрой людзям. Усё, што трэба рабіць, — усміхацца і спрабаваць спадабацца ўсім.

Нягледзячы на просты рэцэпт, кніга хутка стала галоўным падручнікам амерыканцаў па этыкету. Запаветы Карнэгі таксама разглядаюць як узор амерыканскай ідэалогіі самаразвіцця асобы. Той факт, што ты прайшоў курсы Карнэгі, лічыцца вялікім плюсам у рэзюме тых, хто шукае працу.

Чым больш быў папулярны Карнэгі, тым больш у яго было праціўнікаў. Па-першае, кніга яўна разлічана на белых амерыканскіх мужчын. Чарнаскурым і жанчынам парады Карнэгі яўна не пасуюць. Афраамерыканец можа ўсміхацца колькі заўгодна свайму босу, аднак у грамадстве з расісцкімі забабонамі гэта ніколі не стане для яго сацыяльным ліфтам. Не кажучы пра тое, што той чарнаскуры, як кажуць праціўнікі расізму, страціць сваю ўнікальную афрыканскую душу.

Яшчэ горш справа з жанчынамі. Калі жанчына на працы пачне ўвесь час пасміхацца, гэта ўспрымуць хутчэй як флірт. Адным словам, праціўнікі расавай сегрэгацыі і феміністкі ахвотна атакавалі тэорыю Карнэгі.

Ніколі не шанавалі Карнэгі левыя. Адпаведна ім, прапанаваная Карнэгі этыка — гэта кодэкс паводзін паслухмянага раба. Пралетарый вымушаны цалкам следаваць капрызам адміністратара, паколькі самым вялікім злом, адпаведна Карнэгі, ёсць канфлікт. У тым ліку і класавы. Некаторыя левыя называлі кнігу Карнэгі папулярнай адаптацыяй працы Вебера «Пратэстантызм і дух капіталізму».

У 1970-я гады пачынаецца бум альтэрнатыўнай псіхалогіі. Яе прыхільнікі адразу пабачылі ў прынцыпах Карнэгі замах на сутнасць асобы. Набыла папулярнасць канцэпцыя анты-карнэгі. На думку яе заснавальніка Эверэта Шострама, маніпуляцыі з уласнай псіхікай кепска адбіваюцца як на жыцці саміх маніпулятараў, так і на жыцці іх блізкіх. Маніпулятар губляе магчымасць выяўляць сябе шчыра і такім чынам губляе сябе. Шострам і яго прыхільнікі, наадварот, заклікалі не пасміхацца кожнаму, а быць патрыётам сваёй асобы.

Падчас контр-культурнай рэвалюцыі на Захадзе быць дысцыплінаваным увогуле стала не модным. З Карнэгі пачалі здзекавацца. Так нарадзіўся славуты анекдот: «Прачытаў Карнэгі, вырашыў, што наступны дзень пачну з усмешкі. Усю першую палову дня старанна ўсім усміхаўся, па магчымасці шчыра. У абед да мяне падышоў начальнік і сказаў: «Яшчэ раз з’явішся на працы абкураны — звольню!» Праўда, хутка Захад ахапіла мода на тое, каб быць япі — маладым паспяховым прадпрымальнікам. І Карнэгі перажыў рэнесанс.

Уладальнікам аўтарскіх правоў на выданне «Як заваёўваць сяброў…» давялося неяк рэагаваць на крытыку. У 1981 годзе выйшла новая рэдакцыя кнігі, у якой не было тэкстаў, якія можна было палічыць расісцкімі. Стала больш прыкладаў з жыцця жанчын. З таго часу працу Карнэгі намагаюцца час ад часу актуалізоўваць. Устаўляць больш прыкладаў з сучаснага жыцця.

Так, асобную частку прысвяцілі папулярным у моладзі татуіроўкам. Аказваецца, з іх дапамогай можна таксама заваёўваць сэрцы. Як, дарэчы, і праз кампутарныя гульні.

Мадэрнізаваць тэксты Карнэгі проста. Апошнім часам сярод фанатаў Карнэгі ёсць думка, што яго творчасць стала ахвярай карпаратыўнага бізнэсу. Новыя версіі «Як заваёўваць сяброў» проста насычаныя жаргонам менеджараў. Кшталту — «трансакцыя», «кантынуум магчымасці», «інтэрперсаналізм», «дынамічны інтэрфэйс». Іншымі словамі, кнігу ўсё часцей разумеюць як практычны даведнік для тых, хто плануе прайсці інтэрв’ю, упісацца ў працоўны калектыў і спадабацца кіраўніку. Сам Карнэгі, калі верыць яго біёграфам, успрымаў сваю тэорыю як больш універсальную і гуманістычную.

Акрамя таго, канцэпты Карнэгі пабудаваныя на схеме камунікацыі — твар у твар. Між тым, сёння ўсё папулярней становіцца камунікацыя праз электронную пошту, скайп або нейкі чат ці форум. Гэта абсалютна іншая форма зносінаў, да якіх карнэгіянская ўстаноўка «ўвесь час усміхайцеся!» яўна не пасуе. Хаця б таму, што інфармацыя перадаецца ў вельмі малым тэкставым аб’ёме — пару сказаў. Можна, натуральна, таксама ўжываць «смайлікі», аднак каэфіцыент іх карыснага дзеяння вельмі малы.

Праўда, карнэгіфілы ўжо актыўна працуюць у гэтым накірунку, збіраючы прыклады, як з дапамогай перапіскі ў інтэрнэце можна было маніпуліраваць адрасатам. Акрамя таго, яны даюць добрыя парады: «Не карыстайцеся службай СМС у тэатры або кінатэатры. Святло можа выклікаць раздражненне ў суседзяў, ніколі не публікуйце навінаў з жыцця вашых сяброў у сацыяльных сетках, не сінхранізуйце профілі на Facebook і Twitter. Плынь навінаў з Twitter на вашай старонцы Facebook можа нерваваць яго наведвальнікаў і г.д.

Адны словам, Карнэгі не стаіць на месцы. Хаця цалкам магчыма, што з такімі тэндэнцыямі праз пару гадоў новая версія кнігі Дэйла Карнэгі будзе называцца «Як фрэндзіць сяброў і прымушаць іх дасылаць смайлікі».

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ДЗМІТРЫЙ МЯДЗВЕДЗЕЎ



Прэзідэнт Расіі вырашыў гучна пляснуць дзвярыма перад сваім сыходам з пасады ў наступным годзе. Прычым пляснуць як мінімум на ўвесь свет. Ён збіраецца вырашыць стары міжнародны канфлікт у Прыднястроўі шляхам рэінтэграцыі краю ў склад Малдовы. У сваю чаргу, Кішынёў павінен будзе заявіць аб нейтральным статусе аб’яднанай Малдовы. Гэты план сапраўды напалеонаўскі, паколькі ўсе папярэднія спробы вырашэння Прыднястроўскага канфлікту былі правальныя. Самая галоўная праблема Мядзведзева — Ігар Смірноў, прыднястроўскі прэзідэнт, які катэгарычна супраць рэінтэграцыі. Насуперак парадам Крамля, ён у пяты раз выставіў сваю кандыдатуру на прэзідэнцкую пасаду (выбары адбудуцца ў снежні). Больш за тое, ён пачаў кампанію супраць кандыдата Анатоля Камінскага, якога ледзь не адкрыта падтрымлівае Крэмль. Здаецца, што вайна са Смірновым набывае самыя радыкальныя формы. Інакш бы Масква не пайшла на наступны крок. 14 кастрычніка кіраўнік «Роспотребнадзора» Генадзь Анішчанка заявіў, што Масква можа ўвесці забарону на імпарт прадукцыі заводу «Квінт». Завод «Квінт», які належыць клану Смірнова, выпускае славутыя брэндзі і віны, якія пасутнасці з’яўляюцца візітнай карткай краю.

### МАНФРЭД ГЕРЛАХ



Старшыня Дзяржаўнага савету Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі (фармальна, вышэйшы орган краіны да сакавіка 1990 года, калі яго функцыі былі перададзеныя парламенту) памёр ва ўзросце 83 гадоў. Такім чынам пайшоў з жыцця апошні афіцыйны кіраўнік ГДР, якой ён кіраваў як старшыня Дзяржсавету ў 1989–1990 гадах. Таксама варта адзначыць, што Манфрэд у час ГДР не быў сябрам Аб’яднанай сацыялістычнай партыі (SED), якая правіла ва Усходняй Германіі. З 1976-га ён ўзначальваў Германскую ліберальна-дэмакратычную партыю (адна з так званых «блокавых» партый, наяўнасць якіх павінна была сведчыць пра палітычны плюралізм у ГДР). Яшчэ да аб’яднання Германіі актыў LDPD прыняў рашэнне аб самароспуску партыі і ўваходжанні ў склад заходняй нямецкай ліберальнай Партыі вольных дэмакратаў(FDP). Быў сябрам FDP і Герлах, пакуль у 1993-м яго не выключылі за тое, што ён супрацоўнічаў са Штазі. Іншага, праўда, цяжка было чакаць ад палітыка, які адказваў у ГДР за канструктыўную апазіцыю.

### ЖАН-ЛЮК МЕЛЕНХОН

Кандыдат у прэзідэнты Францыі ад кааліцыі «Левы фронт», куды разам з камуністамі ўваходзяць шэраг левых радыкальных партый, публічна кінуў выклік сацыялісту Франсуа Аланду, які на мінулым тыдні перамог на ўнутрыпартыйных выбарах за права быць кандыдатам у прэзідэнты ў наступным годзе. Меленхон усур’ёз лічыць, што зможа пазбавіць Аланда вобразу галоўнага канкурэнта Ніколя Сарказі. Ён лічыць, што адзіная розніца паміж Аландам і Сарказі — гэта колер шыкоўных гальштукаў, якія абодва носяць. Ён таксама называе Аланда «эканамічны тарыф для левых». Пакуль шансы Меленхона (дарэчы, ён сам пачынаў як сябра Сацпарыі) выціснуць Аланда з нішы галоўнага апанента Сарказі не ўспрымаюцца ўсур’ёз. Хаця б таму, што пра свой намер зрабіць тое ж самае заявілі ўсе іншыя левыя кандыдаты (іх аж пяць). Хаця ўсё можа быць. Меленхон вядомы як фантастычны прамоўца і папуліст. Прэса нават неяк назвала яго «французскі Лукашэнка».



▸ УЗГАДАЦЬ УСЁ

# НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ: ПАЧАТАК

Алег НОВІКАЎ

**Авантура ГКЧП за тры дні зрабіла тое, на што, мяркуючы па стану грамадскай думкі на сярэдзіну лета 1991-га, спатрэбілася б яшчэ некалькі гадоў. Не дзіўна, што аформіць прыход новай эры ў адпаведнасці з канонамі проста не паспелі.**

У дадатак дзень для абвяшчэння незалежнасці — 25-га жніўня — быў абраны яўна няўдала. Дастаткова ўзгадаць, што гэта была нядзеля, калі шмат людзей традыцыйна «адпачываюць» на фазэндах (так пачалі называць дачныя соткі пасля серыяла «Рабыня Ізаура»). Да таго ж у дзень надання «Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце» сілы канстытуцыйнага закона панавала спякота. У выніку сведак гістарычнай падзеі было няшмат, прыкладна 5 тысяч палітычна заклапочаных грамадзян, якія сабраліся на плошчы імя Леніна. У параўнанні з той жа суседняй Украінай або Літвой усё выглядала нейк сумбурна, хаатычна.

Публіцыст Сямён Букчын пакінуў наступныя нататкі пра Мінск увечар дня абвяшчэння незалежнасці. «Што адбываецца ў краінах, як рэагуюць народы, калі знаходзяць доўгачаканую незалежнасць. Кажуць, што, калі гэта здараецца падвечар, людзі выходзяць на вуліцы, гараць агні. Адным словам, усеагульнае ажыўленне, незвычайны духоўны ўздым. Увечары мінулай нядзелі наш ВС прыняў закон пра дзяржаўны суверэнітэт Беларусі, я дарма шукаў на гарадскіх вуліцах хоць нейкія прыкметы народнай весялосці… горад быў пусты звычайнай пустэчай, якой заканчваюцца нядзелі. Што ж тычыцца агнёў, то а 11-й гадзіне ў Савецкім раёне адключылі электрычнасць».

Аднак выбіраць, па-сутнасці, не даводзілася. Прамаруджванне было сапраўды падобнае да смерці. Партыйна-савецкая наменклатура магла выйсці са ступару, у які яе ўвяла параза путчу, і заблакаваць Дэкларацыю аб незалежнасці.

Сумбурнасць пры абвяшчэнні беларускай незалежнасці хутчэй указвае на непрадказальнасць сітуацыі, якая развіваліся ў той час надзвычай дынамічна. Яшчэ тыдзень да гэтага ніхто нават уявіць сабе не мог, што Беларусь стане незалежнай, а Кампартыя Беларусі страціць легальны статус. Прычым галасаваць за тыя пастановы будзе партакратыя, якая як агню баялася расійскіх дэмакратаў. Менавіта на гэтай параноі і згуляў дэмакратычны блок. Калі верыць Навумчыку, пераломным на сесіі Вярхоўнага Савета стаў выступ Зянона Пазняка, які заявіў, што ў Расіі «фармуецца маладая агрэсіўная імперыя ў форме дэмакратыі». «Я прашу вас паставіць гэтае пытанне і вырашыць яго сёння. Бо заўтра можа быць позна», — заклікаў Пазьняк. Камуністы ў жаху пачалі ціснуць кнопкі. Прапанова пра незалежнасць атрымала большасць галасоў.

Што тычыцца сціплай лічбы прысутных 25 жніўня 1991 года на плошчы, то яе, магчыма, кампенсуе наступны факт: менавіта са жніўня прысутнасць грамадзян перад Домам ураду стала нормай. Насупраць помніка Леніну ўзнік намётавы лагер, які пратрымаўся аж да зімы 1992 года. Хто тут толькі ні тусаваўся! Ад дэлегацыі літоўскіх беларусаў, якія патрабавалі інкарпараваць у склад Беларусі Віленскі край, да камуністаў, якія абаранялі помнік Леніну, мусіруючы чуткі, што дэмакраты збіраюцца паставіць замест Ільіча статую Леха Валенсы.

Цяжка пагадзіцца з тым жа Букчыным, што народу ідэя незалежнасці была па барабану. Мяркуючы па зводках газет, незалежнасць была ўспрынятая насельніцтвам дастаткова лаяльна. Тым больш, што яна пасавала папулярнай тады ў народзе думцы аб вывазе з рэспублікі ў Расію дэфіцытных тавараў. Як пісаў у тыя часы Уладзімір Арлоў: «Незалежнасць — гэта калі велізарныя аўтафуры з надпісам «Цэнтровывоз» (ці бачыў ты хоць раз такія фуры, дзе было б напісана «Цэнтраввоз»?) падрульваюць не да чужых, а да нашых крамаў».

Пра наяўнасць такога «незалежніцкага» настрою сведчыць выпадак у Барысаве. Прыкладна праз пару дзён пасля атрымання суверэнітэту на барысаўскай аўтабазе, якая належала арганізацыі «Смоленскдорстрой», пасрабавалі паставіць на машынах расійскія нумары. Шафёры заблакавалі выезд машын з прадпрыемства. «Хочам працаваць для Беларусі!» — крычалі яны.

Знешнюю пасіўнасць насельніцтва 25 жніўня можна патлумачыць таксама і тым, што многія не ўспрымалі абвяшчэнне незалежнасці ўсур'ёз. Ідэю заключэння новага Саюза абараняла нават заўважная частка дэмакратаў, якая баялася, што кансерватыўная камуністычная большасць у ВС затармозіць рынкавыя рэформы. У дадатак фармальна Беларусь працягвала быць суб'ектам Новагароўскага працэсу, лабістам якога быў Міхаіл Гарбачоў, што вярнуў сабе папулярнасць. Нават называліся даты падпісання новай саюзнай дамовы. У верасні, наведваючы ФРГ, абраны на пасаду спікера Станіслаў



Галіна Сямдзянава прынесла ў Вярхоўны Савет бела-чырвона-белы сцяг 24 жніўня 1991 года

Шушкевіч выступіў супраць устанаўлення дыпламатычных адносін РБ з замежнымі краінамі.

Аднак канкрэтныя абставіны патрабавалі ад уладаў стварэння атрыбутаў для кагосьці жаданай, для кагосьці нежаданай незалежнасці. Без гэтых атрыбутаў не магла працаваць адміністрацыйная вертыкаль. На вастры атакі за найхутчэйшае ўвядзенне новай сімволікі і ўсіх інстытутаў суверэннай дзяржавы ішла фракцыя БНФ у Вярхоўным Савеце і дастаткова ўнушальная нацыянальна-дэмакратычная плынь па-за ім (па сацыялагічных апытаннях, БНФ падтрымлівала 15–20 працэнтаў насельніцтва). Канец жніўня-верасень — час, калі ліхаманкава ствараўся каркас айчыннай дзяржаўнасці: сімволіка, МЗС, Нацбанк, войска і г.д.

Так, насуперак заявам Шушкевіча ў Берліне, былі ўсталяваныя дыпламатычныя адносіны з Літвой. Адбылося гэта падчас вераснёўскага візіту ў Мінск Вітаўтаса Ландсбергіса. Візіт трошкі сапсаваў непрыемны інцыдэнт. Госць нечакана заявіў, што літоўцы збіраюцца называць Беларусь — «Рэспубліка Гудзіес» (ад «гуд», што па-літоўску «іншаземец»). Нашым інтэлектуалам гэта не спадабалася. Яны рашуча выступілі за варыянт «Балтарусія».

Услед за візітам Ландсбергіса ў Вільню накіраваўся Шушкевіч. Там ён трапіў у аналы гісторыі. Старшыня ВС стаў першым замежным палітыкам, якога ў новай незалежнай Літве сустракала ганаровая вайсковая варта. Для такога выпадку Станіслаў Станіслававіч вывучыў фразу па-літоўску: «Вітаю вас, мужныя змагары».

А 1 кастрычніка пачаўся першы прызыў у беларускую армію. І адразу ўзнікла праблема. Не хапіла навабранцаў, каб забяспечыць Беларускую вайсковую акругу, на базе якой і ствараліся войскі. У казармы забрылі толькі 77 працэнтаў ад патрэбнай колькасці. Выйсце прапанаваў камісар Ленінскага РВК Уладзімір Чарданцаў. Па яго словах, з улікам добрых адносін з Узбекістанам і Кіргізіяй, трэба папрасіць у Карымава і Аліева крыху прызыўнікоў. Ва Узбекістане з прызыўнікамі быў відавочны перабор — 346 працэнтаў. А ў Кіргізіі — увогуле 660. Войска нейк укамплектавалі без кіргізаў і ўзбекаў, і адразу ж распачаліся дэбаты пра скарачэнне арміі — адна з самых вялікіх і складаных тэмаў для маладой дзяржавы.

Узнікла праблема і з нацыянальнай сімволікай. 19 верасня дэмакраты дамагліся зацвярджэння новага сцяга, і нават прызначылі час змены сцягоў — 20 верасня, а 10-ай гадзіне. Але нехта спрацаваў на апярэджанне і ўсталяваў «наш бел-чырвона-белы штандар» з самай раніцы. Прыгожы сцяг лунаў над сталіцай, але ж цырымонія была сапсаваная. Журналісты, якія прыйшлі а 10-й на плошчу Леніна, былі вельмі незадаволеныя.

Плошчы Леніна, дарэчы, хутка не стала. Мінгарсавет перайменаваў яе ў плошчу Незалежнасці. Змянілася назва і галоўнага праспекта сталіцы. Дарэчы, першым злачынствам, зафіксаваным на нованазваным праспекце імя Францыска Скарыны, стала збіццё грамадзяніна Габону. Шпана экспрапрыіравала ў яго скураную куртку і 300 французскіх франкаў.

Больш складанай была справа з гербам Пагоня. Рэдакцыя газеты «Звязда» (якую, дарэчы, прапаноўвалі перайменаваць у «Зорку») прапанавала наўпрост прыклеіць Пагоню ў цэнтр гербу БССР. Нейкія пацыфісты патрабавалі прыбраць з рукі вершніка меч, бо гэта знак мілітарызму, архаізм для канца XX стагоддзя. Былі пярэчанні і з-за падабенства беларускага і літоўскага гербаў. Цікавы адказ для падобнай публікі прыдумаў гісторык Алег Дзярновіч. Ён заклікаў выкарыстоўваць у якасці гербу варыянт Пагоні, які месціцца на вокладцы Трэцяга Статуту ВКЛ. Наверсе той Пагоні намаляваная карона. «Карона (сімвал сюзерэнных улады) будзе сімвалам суверэннасці беларусаў. Ну а летувісы хай карыстаюцца пагоняй без кароны», — аўтарытэтна адзначаў Алег.

Сёння тая дыскусія ўражвае сваёй вастрынёй. Аднак трэба згадаць, што пачатак 1990-х быў вельмі спецыфічнай эпохай. Першыя дні беларускай незалежнасці супалі з зенітам галоснасці. Голад страўнікавы яшчэ не паспеў выцесніць голад інфармацыйны. Задавальнялі прагу інфармацыі ўсім — споведзямі путанаў, байкамі пра іншапланецян, фокусамі экстрасэнсаў. Орган камуністаў — газета *«Мы и время»* — скардзіўся на аршанскую раёнку *«Ленинский призыв»*, якая на працягу 14 выпускаў (!) на ўсю газетную старонку знаёміла аршанцаў з «Сакрэтамі майстэрства Бруса Лі». Між тым, тая ж *«Мы и время»* не саромелася распавядаць пра амерыканскі крэйсер, які, калі верыць публікацыі, стаіць на рэйдзе балгарскай Варны і апраменьвае адтуль Гарбачова і Ельцына з устаноўкай на працяг перабудоўчых працэсаў.

Перманентнае спажыванне сенсацый фармавала дзіўную форму разумення рэальнасці. Людзі верылі ў самыя фантастычныя праекты. Літаральна напярэдадні путчу прэм'ер Кебіч сустрэўся з прафесарам тэхаскага ўніверсітэту Скотам Нордвудам і прасіў яго стварыць у БССР паўнавартасную рынкавую структуру. «Ноу проблем», — сказаў яму амерыканец.

Другім фонам першых месяцаў незалежнасці стаў працэс першапачатковага накаплення капіталу. Ідэя рынку крочыла ў масы. Так, у піянерскім лагеры «Юны хімік», што пад Гомелем, улетку 1991-га ўвялі сваю грашовую адзінку *«терюхан»*. За адзін *«терюхан»* можна было ўвечары пасядзець каля кастра.

Формулу абагачэння ведаў кожны смяротны: набыць нешта ў Беларусі і прадаць за мяжой. Праз брэсцкі вакзал у летнія дні 1991-га штодня туды-сюды праязджала да сямі тысяч чалавек. У прэсе ішла дыскусія, што рабіць з Камароўкай — самым вялікім сталічным рынкам. Нарэшце ў кастрычніку было прынятае канцэптуальнае рашэнне перанесці рынак на стадыён «Дынама». Такое рашэнне, думаецца, віталі футбалісты мінскага спартыўнага таварыства «Дынама». Дзякуючы грошам камерсантаў нарэшце ўдалося ўключыць на стадыёне гарачую ваду. Магчыма, калі б ваду далі раней, дынамаўцы згулялі б лепш. А так сезон 1991-га яны закончылі ў сярэдзіне табліцы.

Між тым, адначасова з нефармальным бізнэсам з'явіўся крымінал. У 1991 годзе рэкет стаў атрыбутам паўсядзённага жыцця. Часам браткі дзейнічалі вельмі арыгінальна. Так, на варшаўскім рынку «Стадыён», дзе гандлявалі «чаўнакі» з Беларусі, паўстала нейкая банда ў выглядзе вулічнага ансамбля. Выканаўшы музычны нумар, музыкі прасілі ў гандляроў ганарар у 30 тысяч злотых (на той час 1 долар). Таму, хто адмаўляўся, пырскалі ў твар нейкую хімію са словамі: «Аста ля віста, бэбі!» — культавай фразай з фільму «Тэрмінатар», які з трыумфам прайшоў па кінатэатрах летам 1991-га.



Васіль Быкаў і Зянон Пазьняк, 1993 год

НАРОДНЫЯ ЎМЕЛЬЦЫ

# МАЙСТАР КЕРАМІКІ, ЯКІ ПІША ВЕРШЫ І СПЯВАЕ ПЕСНІ

Сяргей ЧЫГРЫН

**Сяргея Худзяева ў вёсцы Галынка Зэльвенскага раёна лічаць сапраўдным народным ўмельцам. Ён адзіны на Гродзеншчыне майстар па чорнадымленай кераміцы. За сваё майстэрства і аднаўленне старажытнага рамяства ён шмат разоў узнагароджваўся дыпломамі і медалямі на розных выставах і фестывалях Беларусі.**



**Даведка:**

Сяргей Худзяеў нарадзіўся на Зэльвеншчыне ў вёсцы Пруд. Скончыў Брэсцкі політэхнічны інстытут. Працаваў прарабам, інжынерам, настаўнікам, дырэктарам Зэльвенскага раённага Дома рамёстваў у вёсцы Галынка, дзе зараз жыве. Зараз працуе настаўнікам у Парэччы і ў Кастровічах. Акрамя ўрокаў, вядзе ганчарныя гурткі, а таксама гурткі выпілоўвання і выпальвання.

Сяргей Худзяеў — настаўнік працоўнага навучання і чарчэння ў вясковых школах суседняга з Галынкай Слонімскага раёна. Таму застаць дома майстра можна толькі ў выходныя. Але і тады ён не сядзіць без справы, а працуе з глінай. За працай я і заспеў Сяргея Худзяева, дзе за ганчарным кругам адбылася наша гутарка.

*— Хто навучыў вас майстэрству чорнадымленай керамікі?*

— Сам навучыўся, бо вельмі хацелася навучыцца таму майстэрству, чым у нас мала хто займаецца. І спыніўся я менавіта на чорнадымленай кераміцы, якою некалі вельмі актыўна займаліся народныя майстры з Ружанаў, Пружанаў. Гэта чорнадымленая кераміка ў свой час мела вялікі поспех у Польшчы. І я самастойна пачаў вывучаць усе друкаваныя матэрыялы, запісваць старых людзей, якія займаліся керамікай, збіраў іншыя звесткі, звязаныя з керамікай. І прыйшоў да высновы, што выраблядь керамічны посуд — гэта не так і складана. Галоўнае тут — умець рабіць абпал гліняннага посуду. Я зрабіў спецыяльную печ для абпальвання. Потым пабудаваў яшчэ адну печ. Не ўсё атрымлівалася спачатку, было шмат браку. Але цяпер навучыўся гліняныя вырабы абпальваць цудоўна, амаль без браку. Пераважыўшы апальванне ў агні, посуд накіроўваецца альбо ў спецыяльны адвар, і атрымліваецца прыгожы ўзор, альбо ў дым, калі печ пасля апальвання замазваецца глінай, каб паветра не праходзіла, і амаль суткі вырабы «даходзяць» — у выніку чаго і атрымліваецца чорнадымленая кераміка.

*— Вы выбляеце выключна посуд?*

— Не толькі. Паводле свайго прызначэння кераміка падзяляецца на посуд, на рэчы мастацтва або культу, на будаўнічыя вырабы і г.д. Я займаюся посудам, а ў апошні час спрабую выраблядь і гліняныя цацкі. Дарэчы, гліняныя фігуркі ляпілі яшчэ ў першабытныя часы. Вучоныя-археолагі адкопваюць у старадаўніх курганах фігуркі коней, сабак і іншых свойскіх жывёлін, а таксама бразготкі ў выглядзе пустога шарыка з каменьчыкам усярэдзіне. Страсянеш — бразгаціць. На думку вучоных, свістулькі і бразготкі ўжываліся нашымі далёкімі продкамі не толькі як забаўкі: лічылася, што яны ахоўвалі ад «нячыстай сілы». Свіст нібыта адганяў злых духаў, аберагаў ад іх дзяцей. Таму я выбляю і керамічныя свістулькі.

*— Вы таксама ведзяце дзіцячыя гурткі?*

— Хочацца, каб нашы дзеткі адчувалі прыгожае, вучыліся на добрых прыкладах і самі рабілі дабро. Край наш вельмі багаты на таленты, шмат творчых людзей выйшла з Зэльвеншчыны, Слонімшчыны, Дзятлаўшчыны. Дык мо калі і нашы гуртко̆ўцы пра сябе скажуць — тым больш, што сярод іх нямала творчых, здольных асоб. І калі з іх хоць адзін юнак ці дзяўчына захопіцца керамікай у жыцці, то я буду вельмі рады і задаволены.

*— А адкуль вашы здольнасці?*

— Вельмі здольным быў мой дзед па маці Іскра Пётр Ульянавіч. Я добра памятаю яго. Ён быў мясцовым будаўніком. Дзіцячых садкоў раней у вёсцы не было, таму я часам з дзедам хадзіў у сталярку і глядзеў, што ён робіць. Дзед быў майстар на ўсе рукі. Ён рабіў вазы, розныя драўляныя цацкі дзецям, вучыў і мяне сталяраваць. А бацька мой пісаў вершы, добра спяваў і іграў.

***— Ведаю, што і вы, акрамя керамікі, займаецеся і паэзіяй, добра іграеце на гітары, часам выступаеце як бард. Дый чытаў вашы вершы ў мясцовым друку, у калектыўных зборніках, у «ЛіМе». Магчыма, вершаў назбіралася ўжо на добрую кніжку і час выдаць іх асобным выданнем?***

— У мяне іншая задума ёсць. Я хачу напісаць і выдаць кніжку пра гліну, пра кераміку. Гэта будзе не навуковая і даследчая кніга. Даследчыкаў керамікі ў Беларусі шмат. Найбольш вядомы і вопытны даследчык керамікі — наш сябра Яўген Сахута. А гэта будзе кніга пра тое, як я асабіста працую з глінай, займаюся керамікай. У гэтую кнігу планую ўключыць і свае вершы. І гэта павінна атрымацца такая керамічная-паэтычная кніга. У ёй я кераміку не пакрыўджу і для паэзіі месца знойдзецца.

ЦІКАВА

# «І КОЛЬКІ Б ДЗЕ НІ ВАНДРАВАЎ…»

Лявон ЦЕЛЕШ

**Алесь Баркоўскі — асоба неардынарная. Ён і гісторык, і перакладчык, і краязнаўца, і да таго ж падарожнік. Яго імя я згадваў у артыкуле пра беларускага паэта, празаіка Івана Ласкова («Новы час», №28, 2011). Сустрэцца і пазнаёміцца з Алесем Баркоўскім мне давялося сёлета, дзякуючы дапамозе вядомага беларускага пісьменніка, літаратуразнаўца Адама Мальдзіса.**



Алесь Баркоўскі (справа) і Віктар Баландзін

З першага погляду яго каранастая постаць і абветраны смуглы твар нагадалі мне герояў маіх любімых прыгодніцкіх раманаў: капітана парусніка з нязменнай люлькаю ў зубах ці адважнага пакарыцеля Аляскі з раманаў Джэка Лондана. Маё ўражанне спраўдзілася: на сваім пакручастым, поўным рамантыкі жыццёвым шляху кім толькі не даводзілася Алесю Баркоўскаму быць.

Яго бацькі Анатоль і Зінаіда (у дзявоцтве Камлюк) Баркоўскія паходзілі з вёскі Міханавічы Мінскага раёна. Дзед, Міхась Баркоўскі, сваімі ратнымі подзвігамі вызначыўся ў часы Першай сусветнай вайны. Стрыечны дзядзька Алеся, Анатоль Баркоўскі, быў вядомым савецкім дыпламатам, амбасадарам у шэрагу краін свету. Бацьку Алеся пасля заканчэння школы МУС накіравалі на працу ў пасёлак Асятрова, Іркуцкай вобласці, дзе і нарадзіўся ў 1953 годзе герой гэтага артыкула. У 1963 годзе Алесь Баркоўскі разам з бацькамі пераехаў у горад Дзяржынск Мінскай вобласці, дзе і скончыў у 1970-м сярэднюю школу №2.

Юнака, напэўна, з дзяцінства зачаравалі сібірскія абсягі, бо адразу пасля заканчэння школы ён падаўся ў Якуцк. У гэтым горадзе Алесь Баркоўскі скончыў Якуцкае рачное вучылішча (суднавадзіцельскае аддзяленне). Два гады праслужыў у арміі на Далёкім Усходзе, і з 1975 года пачаў працаваць капітанам-механікам у Ленскім і Якуцкім параходствах. У гэтай якасці за часы навігацыі Алесь Баркоўскі безліч рэйсаў прайшоў па магутнай сібірскай рацэ амаль ад вытокаў да самага Паўночнага Ледавітага акіяна, часам у цяжкіх метэаралагічных умовах. За добрасумленную працу атрымаў медаль ад Міністэрства рачнога флоту РФ.

Даводзілася яму працаваць і на Алданскіх залатых прысках, і на будаўніцтве першай чаргі мінскага метро. Працуючы ўдалечыні ад роднай Беларусі, Алесь Баркоўскі не забываў пра яе. Па яго ініцыятыве і дзякуючы яго намаганням у Якуцку была заснавана беларуская суполка «Суродзіч», выдавалася газета «Паўночнае зьзянне».

Алесь Баркоўскі размаўляе выключна на беларускай мове. Валодае дасканала польскай і якуцкай мовамі. З рускай на беларускую мову ён пераклаў творы Уладзіміра Высоцкага і Міхаіла Лермантава, з польскай — Тадэвуша Лады-Заблоцкага, з беларускай на рускую — творы Францішка Аляхновча, з беларускай на якуцкую — артыкулы беларускага пісьменніка Сяргея Палуяна. У якуцкіх архівах Алесь Баркоўскі знайшоў шмат дакументаў пра беларусаў, сасланых у Сібір пасля паўстання 1863 года і на пачатку XX стагоддзя.

Вялікія заслугі Алеся Анатольевіча ў збіранні творчай спадчыны беларускага, рускага і якуцкага паэта Івана Ласкова. Нядаўна я наведаў кватэру маці спадара Алеся, што знаходзіцца ў Дзяржынску. У адным з пакояў кніжныя паліцы ад падлогі да самай столі застаўленыя папкамі з творамі Івана Ласкова, выдадзенымі і яшчэ не выдадзенымі. Гэтыя рукапісы, прывезеныя з Якуціі, Алесь Баркоўскі ў сваёй хатняй друкарні Кальвіна перапрацоўвае ў кнігі, раздрукаваныя на ратапрынце і пераплеценыя.

Алесь Баркоўскі — чалавек шчодрай душы, мецэнат у найлепшым сэнсе гэтага слова і робіць шматлікія падарункі сваёй Бацькаўшчыне. Многія матэрыялы, звязаныя з жыццём і творчасцю Івана Ласкова, ён перадаў у Беларускі дзяржаўны архіў — музей літаратуры і мастацтва, а ў Цэнтр імя Францішка Скарыны перадаў вялікі збор перакладаў беларускай літаратуры на іншыя мовы.

Давялося Алесю Баркоўскаму наведаць многія краіны свету і пазнаёміцца з вядомымі людзьмі. Наведаў ён Вялікабрытанію, дзе ў бібліятэцы імя Францішка Скарыны атрымаў у падарунак шмат каштоўных кніг беларускіх пісьменнікаў-эмігрантаў. А ў Лондане ён нават дапамагаў весці набажэнства айцу Аляксандру Надсану. За акіянам ён пазнаёміўся з многімі беларускімі паэтамі-эмігрантамі. У яго хатняй бібліятэцы шмат кніг з аўтографамі Наталлі Арсеннеевай, Рыгора Крушыны і іншых. Вядомы беларускі паэт- эмігрант Масей Сяднёў нават прысвяціў яму адзін са сваіх вершаў.

Дзякуючы Алесю Баркоўскаму значна папоўніліся фонды Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, якой ён перадаў у падарунак звыш 300 экземпляраў кніг беларускіх пісьменнікаў-эмігрантаў, рынкавы кошт якіх складае некалькі дзесяткаў тысяч долараў. Узнагародай Алесю Баркоўскаму было прысваенне яму звання пажыццёвага ганаровага чытача бібліятэкі.

Выданнямі калекцыі Алеся Баркоўскага шырока карыстаюцца многія беларускія літаратуразнаўцы, гісторыкі, пісьменнікі, такія, як Лідзія Савік, Яўген Лецка, Віталь Чаропка і іншыя. Сёлета Алесь Баркоўскі амаль усё лета правёў у Якуцку. Нядаўна ён вярнуўся адтуль, завітаў да мяне дамоў на кубачак кавы і расказаў аб выніках сваёй паездкі. Адтуль ён вярнуўся не з пустымі рукамі, а прывёз шмат фотаплёнак, на якіх адлюстраваны Іван Ласкоў і яго сям'я. Мы разам наведалі Беларускі Дзяржаўны архіў кінафотавідэадакументаў, і гэтыя каштоўныя матэрыялы Алесь Баркоўскі перадаў на захоўванне дырэктару архіва Віктару Васільевічу Баландзіну.

Але, «і колькі б дзе ні вандраваў» спадар Алесь, — душой ён заўсёды ў Беларусі. І ўсе яго знаходкі ў вандроўках — пра Беларусь і для Беларусі. Як шмат, аказваецца, можа зрабіць для сваёй Радзімы адзін таленавіты і шчыры чалавек.

АНОНС

# УСІМ, ХТО ЗМАГАЕЦЦА



**Беларускі progressive rock гурт «Re1ikt» рыхтуецца да выхаду новага альбома і прэзентуе відэакліп на загалоўную кампазіцыю дыска.**

«Рэкі прабілі лёд» — так называюцца будучы рэліз і відэа, знятае гомельскім VJ Medwedsky. Музыкі прысвячаюць новую працу ўсім тым, хто змагаецца і нягледзячы ні на што пераадольвае цяжкасці.

Кліп здымаўся ў Гомелі, бо менавіта ў рок-сталіцы Беларусі прайшла значная частка творчага шляху гурта «Re1ikt»: «Хоць пачыналі мы ў Светлагорску, але менавіта на гомельскім лэйбле ўпершыню выйшаў наш альбом, у Гомелі мы выпусцілі DVD «Акустычная тэрапія». Там жа запісалі наш трэці альбом, які выходзіць на «Вігма» пры падтрымцы BMA», — тлумачаць музыкі.

Гомельскія музыкі і іншыя дзеячы андэграўнду з вялікім цяплом і павагай ставяцца да калег, таму ласкава пагадзіліся ўдзельнічаць у здымках кліпа «Рэкі прабілі лёд». Яны папераменна выконваюць новую песню, як бы даючы зразумець, што выбар ёсць у кожнага. І кожны можа нешта зрабіць у гэтым жыцці, галоўнае — захацець.

На мінулым тыдні музыкі выклалі ў сеціва ролік, які адлюстроўвае здымачны працэс. За гэты час яго прагледзелі больш за 1 000 разоў! «Я вельмі рады, што кліп і кампазіцыя выклікала такую цікавасць у слухачоў. Таму што наш новы альбом будзе вельмі прыгожым і мастацкім. Пры стандартным для рок-музыкі наборы інструментаў мы шмат эксперыментавалі, выкарыстоўвалі розныя эфекты і атрымалі на выхадзе незвычайную музыку», — кажа музыка Аляксандр Дземідзенка.

Паглядзець і спампаваць новы кліп «Re1ikt» можна з афіцыйнага сайта гурта: re1ikt.com. А паслухаць, якім атрымаўся новы дыск «Re1ikt», можна будзе 30 кастрычніка ў рамках канцэртнай прэзентацыі альбома «Рэкі прабілі лёд» у мінскім клубе «Re:Public». У канцэрце прымуць удзел беларускія гурты «Рокаш» і «Partyzone», чые альбомы таксама выйшлі ў гэтым годзе, і «Unia».

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# ЯНЫ ВАС ЧАКАЮЦЬ!

**Аліса — зялёнавокая прынцэса, якая верыць у сваю краіну цудаў.**



Аліса яшчэ маленькая дзяўчынка, белая з рудымі плямкамі. Вельмі ласкавая і вынаходлівая. Ёй каля 4-х месяцаў, вырасце да 45 см. Нехта ўзяў яе шчанюком, але потым вырашыў, што сабака яму не патрэбны. Так Аліса апынулася на вуліцы, дзе яе і заўважылі валанцёры. Пакуль дзяўчынка жыве ў іх, але вельмі чакае сапраўднага гаспадара, які больш ніколі ёй не здрадзіць.

Калі ў душы вы таксама любіце казкі — пасябруйце з Алісай, тэлефануйце!

8-029-7755753 Настасся

**Верачка — вельмі спакойная і ласкавая маладая котка.**

Яна з любоўю ставіцца да дзяцей. Ёй падабаецца ляжаць на падваконні і назіраць, што робіцца на двары, але Верачка не супраць пагуляць з іншымі коцікамі. Яна вельмі сціплая і акуратная. Стэрылізаваная, прызвычаеная да латку. Марыць пра ціхае і шчаслівае жыццё з любімымі гаспадарамі. Спраўдзіце яе мару, тэлефануйце!



8-029-6357203; 8-029-7577117 Надзея.

* * *

Усе гадаванцы — у падарунак.

Болей катоў і сабак — у каталогах на *www.forum.superkot.com*

ФЕСТЫВАЛЬ

# ПОЛЬСКАЕ ЛЮСТЭРКА ДЛЯ БЕЛАРУСКАЙ ДУШЫ

Андрэй РАСІНСКІ

**З 21 па 28 кастрычніка ў беларускіх гледачоў будзе шанец дазнацца пра польскую душу. У Мінску пройдзе фестываль польскіх фільмаў «MOVIK». Кінафэст арганізаваны Беларускім Шуманаўскім таварыствам, мультымедыйным часопісам «34mag.net» і 8 тэлеканалам. Праект падтрымала Міністэрства культуры Польшчы, якая цяпер старшынюе ў Еўрасаюзе.**

У Мінску будуць прадстаўлены фільмы, якім радуюцца самі палякі. Стужкі сталіся папулярнымі на радзіме, яны парасцяганыя на цытаты. Але толькі некаторыя карціны вядомыя ў Беларусі.

Мультфільмы «Болек і Лёлек» (пра пацешных прыяцеляў) і «Рэкс» (пра сабачку) выходзілі ў 60–80-я гады. Але сучасныя беларускія дзеткі іх не бачылі. Таму будуць арганізаваныя адмысловыя ранішнія сеансы, пасля якіх пройдуць творчыя заняткі для дзетак.

Карціна «Сэкс-місія» Юльюша Махульскага, якой адкрываецца фестываль, — для дарослых. Стужка дэманстравалася Савецкім саюзе пад назваю «Новыя амазонкі» і была моцна адцэнзураваная. Цяпер — яе сапраўдная кінапрэм'ера ў нашай краіне.

Камедыйная антыўтопія 1985 года пра таталітарную жаночую грамаду рыфмуецца з сучаснай гісторыяй ад Тамаша Канецкага «Лэйдзіс». Гэта стужка пра чатырох сябровак, якія змагаюцца з абсурдным светам мужчын, натхнёўшыся «Сэксам у вялікім горадзе» і «Адчайнымі хатнімі гаспадынямі».

Фільм «Рэйс» Марэка Півоўскага — камерная чорна-белая падзея 1970 года з зусім іншымі смехавымі акцэнтамі. На турыстычным параходзе, што ціхамірна плыве па Вісле, навапрызначаны «інструктар па культуры» ўпарта дрэсіруе месціч аў сходамі, галасаваннямі, прымусовымі патрыятычнымі спевамі — і шчаснымі выспяткамі пад зад (колькасць выспяткаў асабіста цэнзураваў тагачасны міністр культуры). Фільм — трапны адбітак колішняй эпохі.

Падобны адбітак — карціна «Мішка» Станіслава Барэя, знятая ў 1981 годзе. Дырэктар спартклубу плануе з'ехаць у Лондан, але ў яго ным пашпарце нехта выдраў патрэбныя старонкі. І пачынаюцца бюракратычныя, гаспадарчыя дый побытавыя прыгоды героя. Дый усіх, хто сустрэнецца з ім.

Трагікамедыя «Дзень псіха» Марэка Катэрскага — гэта ўжо не «харавыя спевы», а лірычны маналог чалавека сярэдняга веку, якога напаткаў крызіс. Але, як і героі «Рэйса», персанаж-«псіх» з 2002 года — такі ж знерваваны інтэлектуал, якому няўтульна ў завядзёнцы рытуалаў і звычаяў (хай сабе гэтыя рытуалы і звычаі гледача пацяшаюць).

Маленькія людзі, іх лёс у сістэме — тэма дакументальных дыяментаў Кшыштафа Кесьлеўскага. Гэта раннія карціны польскага рэжысёра, зусім у нас не вядомыя: «З гораду Лодзь» (1969), «Рэфрэн» (1972), «Муляр» (1973), «З пункту гледжання начнога вахцёра» (1977). Але сітуацыі і героі пададуцца нам надзвыча знаёмымі, як той вахцёр, які дапякае людзей стабільнасцю і «парадкам».

«Вяселле» Войцэха Смажоўскага 2004 года — самая скандальная камедыя фестывальнай праграмы. Усё, як заўжды, — вяселле, карнавал, грошы, інтрыгі, абжорства, іронія. На сустрэчы з гледачамі будзе акцёр Барталамей Топа, які сыграў у карціне. А размах польскага вяселля будзе вельмі зразумелы беларускае публіцы.

Фільм «Пазыка» Кшыштафа Краўзэ — гэта іншы жанр, хаця персанажы стужкі таксама апантаныя жарсцямі. Кіно нулявых — вострасюжэтная драма, заснаваная на рэальных падзеях. Двум сябрам падступны бізнэсовец прапанаваў дапамогу пад вельмі высокі працэнт. Але, калі героі трапілі ў фінансавую нявыкрутку, іх жыццё сталася сюжэтам крымінальнага трылера.

А вось бунтоўная дзяўчынка-ўцякачка і яе былы настаўнік дзейнічаюць у драме паразумення Анджэя Якімоўскага «Заплюшчы вочы».

Гутаркі ў польскіх карцінах вельмі жывыя, насычаныя жарганізмамі, многія фразы наўпрост пайшлі ў народ — і таму вельмі інтрыгоўны пераклад стужак. Усе фільмы адмыслова перакладзеныя на беларускую мову і будуць паказаныя ў кінатэатры і на тэлевізіі.

Як сказаў генеральны дырэктар 8 тэлеканалу Пётр Чарнаморац, у каналу мусіць быць нейкая фішка.

Але фішак на гэтым фэсце будзе шмат.

Не прапусціце!

**Расклад паказаў:**

**«Сэкс-місія»** — 21.10 а 20.00
**«Дзень псіха»** 22.10 а 19.00 і 27.10 а 20.00
**«Болек і Лёлек»** — 22.10 а 11.00
**«Рэкс»** — 23.10 а 11.00 (пасля мультфільмаў — творчыя заняткі для дзетак)
**«Лэйдзіс»** — 23.10 а 19.00
**«Пазыка»** 24.10 і 27.10 а 17.00
**«Мішка»** — 24.10 а 19.00
**Дакументальныя фільмы Кшыштафа Кесьлеўскага** — 25.10 а 16.00 (пасля паказу — дыскусія)
**«Рэйс»** — 25.10 а 20.00
**«Заплюшчы вочы»** — 26.10 а 17.00 і 28.10 а 20.00
**«Вяселле»** — 26.10 а 20.00 і 28.10 а 17.00

**Усе фільмы дэманструюцца ў арткінатэатры «Рубін Плаза», праспект Дзяржынскага, 5.**

**Уваход — вольны. Калі не атрымаецца трапіць на паказ, фільмы можна паглядзець на 8 тэлеканале ў дні фестывалю.**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# AD.NAK! ІДЗЕ Ў РЭГІЁНЫ

**Другі фестываль беларускамоўнай рэкламы і камунікацыі AD.NAK! распачаў серыю рэгіянальных прэзентацый.**

Першая з іх адбылася 13 кастрычніка ў Гродне. Узяць удзел у праграме семінараў, прысвечанай вынікам сёлетняга AD.NAK-2 і асноўным тэндэнцыям на рэкламным рынку Беларусі і ў свеце, былі запрошаныя рэкламісты, дызайнеры і вольныя мастакі Гродзеншчыны.

Асноўная мэта правядзення такіх сустрэч — заахвоціць прадстаўнікоў рэкламнага бізнэсу Гродзеншчыны да ўдзелу ў фестывалі і ўвогуле звярнуць іх увагу на тое, што рэклама на беларускай мове можа быць цікавай, крэатыўнай і сучаснай. Работы пераможцаў першага і другога фестываляў, якія былі паказаныя ўдзельнікам падчас прэзентацыі, гэта пацвярджаюць.

У наступным годзе фестываль пройдзе ўжо трэці раз, і арганізатары чакаюць шмат работ ад рэгіянальных прадстаўнікоў рэкламнай галіны ў намінацыях і конкурсах.

Найбольшую цікавасць выклікала тэма сацыяльных сетак у сучаснай рэкламе, якую закрануў у сваім майстар-класе Андрэй Эзерын. Менавіта гэтай тэме была прысвечаная большасць пытанняў аўдыторыі. Людзі актыўна абмяркоўвалі сучасную камунікацыю, рост значнасці інтэрнэт-рэкламы і хуткую зменлівасць усяго рынку. Стасункі спікераў са слухачамі ўмацоўваліся ўзаемнымі абяцаннямі працягваць камунікацыю надалей. Праз акаўнты на фэйсбуку, безумоўна.

**Паводле прэс-службы «Будзьма беларусамі!»**

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1081

Падпісана да друку 21.10.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.